ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дагатанам „Прафрук")

На 1 мес.	—	90 к.
„ 3 мес.	2 р.	80 к.
„ 6 мес.	5 р.	—
„ 12 мес.	9 р.	75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к. Іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—ка. Зьніж тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 к. -здачку.

Москва, Б-ко ЦСНХ СССР
сьвя. студэ. сьпіс

ЗЬВЯЗДА

Пралетары ўсіх краін, злучайцеся!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-86
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
„ абвестак	7-81

СЕРАДА, 5 лістапада 1930 г.
№ 260 (3858)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Далоў дэзарганізатараў сацыялістычнага наступленьня--правых і „левых" апартуністых і нацыянал-апартуністых

Вон з нашых радоў двурушнікаў-апартуністых—агентаў клясавага ворага—здраднікаў справы Кастрычніка

Здраднікам і іх укрывальнікам-маўчальнікам —ня месца ў партыі!

Да XIV году пераможнай Кастрычніцкай рэвалюцыі пралетарыят Савецкага Саюзу падыходзіць з вялізарнымі дасягненьнямі. Лепшай ілюстрацыяй гэтых дасягненьняў зьяўляецца грандыёзнае сацыялістычнае будаўніцтва ў горадзе і ў вёсцы, сярод рыштаваньняў якога мы працуем, зьнікненьне беспрацоўя і рост матар'яльнага забесьпячэньня і культурнага абслугоўваньня рабочай клясы і асноўных мас сялянства.

Нячуваныя тэмпы нашага росту ва ўсіх галінах гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва сталі магчымымі толькі дзякуючы генэральнай лініі партыі, якую правільна і пасьлядоўна праводзіць ленінскі Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) пад выпрабаваным кіраўніцтвам т. Сталіна. Рост творчай актыўнасьці і вялізарнага рэвалюцыйнага энтузіязму рабочай клясы робіць магчымым яшчэ большае, далейшае ўзмацненьне тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньне сацыялістычнага наступу на ўсім фронце. Наша партыя, пад кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК, здолела ня толькі запаліць энтузіязмам сацыялістычнага будаўніцтва масы рабочае клясы, калгасьнікаў, беднату і серадняку, здолела ня толькі вылавіць творчую актыўнасьць гэтых мас, але таксама арганізаваць гэты энтузіязм і актыўнасьць, што выліваецца ў сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, як штодзённыя матады ўсёй нашай работы.

Усе посьпехі першай у сьвеце краіны пралетарскай дыктатуры дасягнуты ў жорсткай барацьбе пралетарыяту з варожымі клясамі, дасягнуты ў жорсткай барацьбе нашай партыі з правым ухілам, найбольш небясьпечным на даным этапе, і «левымі» апартуністымі, а таксама з прымірэнцамі да іх. Гэта барацьба вялася, выходзячы з установкі Леніна, якая дана нашай партыяй: у самы кароткі гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць індустрыяльнае разьвіцьцё перадавых капіталістычных дзяржаў.

Для нашай партыі сьцягам барацьбы за план, за плянавае вядзеньне ўсёй народнай гаспадаркі былі наступныя словы т. Леніна: «Сочачы за вялікам мавукі і практыкі на мясцох, трэба імкнуцца няўхільна да таго, каб ПЛЯН УЗЬНЯЎСЯ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ ЁН НАЗНАЧАНЫ. Гэта запежыць ад нас. Даваўце ў кожнай майстэрні, у кожным дэпо, у кожнай галіне вывучыць гаспадарку, і тады мы тэрмін скароцім» (падкрэсьлена намі).

Выходзячы з гэтай Ленінскай установкі, наша партыя арганізавала масы працоўных на самую напружаную барацьбу і работу з тым, каб скараціць час выкананьня гістарычнай задачы пралетарыяту — «дагнаць і перагнаць». Выходзячы з гэтай установкі, партыя, перачы у сілы і рэвалюцыйны энтузіязм рабочых мас, брала сапраўды бальшавіцкія тэмпы ў пяцігадовым плане сацыялістычнага будаўніцтва з тым, каб хутка, праз год кінуць новы пароль барацьбы: «выканаем пяцігодку за чатыры гады!».

Правыя апартуністыя выходзілі з супроцьлеглых установак. Ня верачы ў сілы рабочае клясы, недаацэньваючы сілы пралетарскага творчага энтузіязму, яны бралі стаўку на вузкія месцы і кольскасьцю налічнай «цэглы» акрасьлялі магчымасьці сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта былі капітулянцкія ўстаноўкі, якія на справе зьяўляюцца выкананьнем сацыяльнага заказу клясавага ворага.

Вялізарны і шпаркі рост нашай гаспадаркі і культуры нараджае рад труднасьцяй. Гэтыя ТРУДНАСЬЦІ РОСТУ абвастраюцца шалёным, зьвярыным супраціўленьнем клясавага ворага — кулацка-капіталістычных элемэнтаў, якія мы ліквідуем. На глебе гэтых труднасьцяй і абвастрэньня клясавай барацьбы, у выніку супраціўленьня клясавага ворага сацыялістычнаму наступленьню, зноў актывізуюцца разгромленыя партыяй апартуністычныя элемэнты ўнутры партыі.

Мэтай іх атак на партыю зьяўляюцца спробы зьменшыць, прыдушыць тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва. І ў тэніх «тэарытычных» практыкаваньнях і ў праваапартуністычнай практыцы яны ўзьнімаюць выцьцё супроць тэмпаў нашага будаўніцтва. Так было да XVI зьезду УсеКП(б), так ёсьць і сёньня.

«ПРАВЫЯ ЎХІЛІСТЫЯ АТАКАВАЛІ ЛІНІЮ ПАРТЫІ Ў АСНОЎНЫМ РАШАЛІНІЮ ПАРТЫІ, У ПЫТАНЬНІ АБ ХУТКІМ ТЭМПЕ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» (з пастаноў XVI зьезду па дакладзе т. Куйбышава).

Апартуністыя на практыцы, бяз доўгіх «тэарытычных» выкладак заяўляюць, як гэта рабіў быць дырэктар Гомсельмашу АМБРАЖУНАС (зараз зьнята з праваапартуністычную практыку), што «Гомсельмаш» і ў трэцім годзе пяцігодкі, ня гледзячы на сваё абсталяваньне, якое разьлічана на выраб 10.000 сіласарэзак, ня можа даць больш, чым 3.000, г. зн. тую колькасьць прадукцыі, якую «Гомсельмаш» даў у першы год сваёй працы, калі завод перажываў яшчэ «дзіцячыя хваробы» росту.

Падобнае праваапартуністычнае выступленьне мела месца і на нядаўнім пашырэным пленуму ЦК КП(б)Б, калі Удзельнік пленуму, сакратар аднаго з райкомаў партыі, т. НІКІФАРАЎ выступіў супроць запраектаванай ЦК лічбы двацаціпроцантнага ахопу калгасамі усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР у веснавую кампанію 1931 г.

Нікіфараў разгарнуў у сваім выступленьні на пленуме апартуністычную тэорыю, раўнаючы на «вузкія месцы», нажучы, што сучасная ўстаноўка на тэмпы ў калектывізацыі можа быць рэальнай толькі ў тым выпадку, калі магчыма будзе разгарнуць у калгасах поўнае механізаванае абсталяваньне.

Выступленьні правых апартуністых сустракаюць неадкладны і самы рашучы адпор з боку ўсіх членаў нашай партыі. Уся партыя цьвёрда і няўхільна, пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, стаіць на варце ленінскіх пазыцый.

За апошні час правыя апартуністыя, якія быццам каліся ў сваіх памылках на XVI зьезьдзе нашай партыі і клялі-ся ў вернасьці партыйнай лініі, адназілі свае атакі на лінію партыі і на яе Цэнтральны Камітэт, ня спыняючы фракцыйнай барацьбы. Двурушнікі, здраднікі рабочай клясы—Рыцін, Сьляпкоў, Марэцкі і іншыя прабавалі ўзяць пад абарону асуджаныя партыяй тэорыі правага ўхілу, прабавалі зноў атакаваць генэральную лінію партыі. Партыя самым рашучым чынам ударыла па двурушніках і здраднікох, бязьлітасна выкідаючы іх са сваіх радоў.

Побач з праваапартуністычнымі двурушнікамі, партыю прабавалі атакаваць двурушнікі — апартуністыя «зьлева» — фрацыянэры Нусінаў, Каўрайскі, Гальпэрын і інш. У той час, калі партыя і пад яе кіраўніцтвам рабочыя масы вядуць самую напружаную барацьбу за перамогу ўсіх труднасьцяй нашага росту шляхам бальшавіцкага ўзмацненьня тэмпаў усёй нашай работы, шляхам стварэньня прыкладаў сапраўды сацыялістычных адносін да працы, — «левыя» і правыя апартуністыя паклёпніцкі абвінавачваюць партыю ў бюракратызацыі і ў адсутнасьці кіраўніцтва, паўтараючы плёткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму. Апартуністыя вядуць атаку на ленінскую ўстаноўку ў адносінах да шпаркіх тэмпаў індустрыялізацыі: «Калі мы вывялі больш», — пішуць апартуністыя, — уменьне прадбачыць гаспадарчыя працасы і адмовімся ад недарэчнай тарапліваасьці і мітусьні, мы зможам забясьпечыць сапраўдныя, рэальныя, хаця і напружаныя тэмпы». Значыць, тэмпы, якія ўзяла партыя, апартуністы лічаць адзнакаю «тарапліваасьці» і «мітусьні»!

Гэтыя фармулёўкі «лявацкі» настроеных двурушнікоў супадаюць з установкамі правых апартуністых, прычым уся сума аргумантацыі і правых і «левых» апартуністых у сваю чаргу супадае з радам аргумантаў, якія высоўваліся кандрацьцеўцамі і іншымі шкоднікамі. Гэта новыпадкова. У гэтым супаданьні мы маем паралічку правых і ня толькі правых, але і «левых» апартуністых, двурушнікаў-фрацыянэраў, з кулацкай кандрацьцеўска-громанаўскай контр-рэвалюцыяй.

Характэрна, што правыя і «левыя» апартуністыя замест цьвёрдай і ўпартай барацьбы за выкананьне прамфінпляну разгортвалі атаку супроць тэмпаў нашага будаўніцтва, узятых партыяй, або робяць стаўку на павышэньне прамысловых цэн (а значыць, на зрыў зарплаты). Як бачым, правыя апартуністыя і «левакі» паўтараюць даўно прэжэваную трацкісцкую жвачку. Гэту жвачку апартуністыя падносяць партыі, як новае «откровение» і ў іншых галінах. І так «левакамі» адноўлены лёзунгі Ломінадзе, Шацкіна, Стэна і інш., аб «крытычна мысьлячых асобах», якія павінны «ўсё ставіць пад сумненьне», лёзунгі, якія ў свой час былі рашуча асуджаны партыяй.

Для правых апартуністых і «левакоў» характэрна недаацэнка вялізарных творчых сіл пралетарыяту і яго рэвалюцыйнай актыўнасьці. Цікава, што гэтыя праваапартуністычныя лёзунгі знайшлі адлюстраваньне і ў камсамоле і навет прасьлізнулі ў матар'ялы бюлетэню «прэс-кліш», які пасланы ў прэзыдыяльны камсамольскі друк. На пленуме ЦК камсамолу Беларусі член ЦК ЛКСМБ, сакратар Горацкага райкаму ЦЕЛІШАЎ, выступіў са сьцьвярджэньнем аб адсутнасьці актыўнасьці ў масах усёй пралетарскай моладзі і ў прыватнасьці ў камсамольскай арганізацыі са сьцьвярджэньнем аб нібы існуючым крызісе ў камсамольскім актыве. Такое-ж праваапартуністычнае сьцьвярджэньне мы чытаем і ў артыкуле, прысланым «прэс-кліш» для камсамольскага друку. У гэтым артыкуле, прысьвечаным новым задачам камсамолу, напісана: «Палітычная і выторчая актыўнасьць за апошні час значна упала сярод моладзі»... Гэтыя праваапартуністычныя, капітулянцкія сьцьвярджэньні павінны атрымаць і атрымліваюць, як гэта мы бачым у разелюцыях шматлікіх партыйных і камсамольскіх сходаў, самы рашучы, моцны і аднадушны адпор.

Адначасова партыя з вялізарнейшым абурэньнем выступае і супроць духоўных правадыроў праваапартуністычных двурушнікаў. Гэтыя правадыры т.т. Бухарын, Томскі, Рыкаў сваім маўчаньнем фактычна ўхваляюць дзеяньні двурушнікаў і здраднікаў партыі. Партыя патрабуе яснага і выразнага адказу ад Бухарына, Томскага і іншых лідэраў правай апазыцыі аб іх адносінах да двурушнікаў і здраднікаў, выключаных з радоў партыі. Партыя патрабуе ад Бухарына, Рыкава, Томскага і іншых, ня толькі вызначэньня сваіх адносін, але і самай рашучай барацьбы з боку Томскага, Бухарына і інш. супроць двурушнікаў і здраднікаў. Такое выступленьне, як выступленьне Рыкава на сходзе рабочых і служачых фабрыкі «Утыльсырэц» (аб чым у нас паведамлялася ва ўчарашнім нумары «Зьвязды»), партыя ня можа інакш расцэньваць, як яўную салідарызацыю з двурушнікамі, як спробу перайсьці ва атаку на партыю і ЦК.

Ужо час т.т. Рыкаву Бухарыну і Томскаму спыніць гульню з партыяй у жмуркі. Партыя не дазволіць манэўраваньня з іх боку і патрабуе правесьці маўчаньне і пачаць рашучую барацьбу пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК супроць праваапартуністых, якія бліскуюцца з «левакамі» для атакі на партыю і яе Цэнтральны Камітэт. Бо ня толькі здраднікам-двурушнікам, але і маўчальнікам, якія салідарызуюцца з імі, ня месца ў радох ленінскай партыі.

Пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, а таксама нядаўна адбыўшыяся сходы актывазгаю раду буйных партыйных арганізацый БССР, рэвалюцыі сходаў партыйных калектываў і ячэек навочна паказваюць, што КП(б)Б разам з усёй УсеКП(б) пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б моцна стаіць на варце бальшавіцкага адзінства.

Арганізацыі КП(б)Б, даючы руйнуючы адпор праваапартуністычным выпадкам і правявам правага ўхілу на практыцы, разам з тым наносяць руйнуючыя ўдары і па спэцыфічнай, у ва умовах нашай краіны, рознавіднасьці апартунізму — па нацыянал-апартунізьме, як праваднёму ў шэрагі партыі контр-рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі.

«... Нацыянал-апартуністы гэта той-жа нацыянал-дэмакрат толькі з партыйным білетам у кішэні» (з дакладу сакратара ЦК КП(б)Б т. Гея на пленуме ЦК КП(б)Б.

У барацьбе за генэральную лінію, у барацьбе на два фронты, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» загібаў, супроць рэштак контр-рэвалюцыйкай трацкісцкай ідэалёгіі і супроць прымірэнцтва да ўхілаў — наша партыя, згуртаваная вакол свайго ленінскага ЦК УсеКП(б), будзе няўхільна ісьці па шляху далейшых перамог у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Адзначым Кастрычнік выкананьнем праграмы сплаву

Капітальнае будаўніцтва прадпрыдпрыемстваў больш поўнае на будаўніцтвы матар'ялы. Забесьпячэньне прамысловых цэнтраў дрывамі — у незадавальняючым становішчы. Лесазаводы працуюць з вялікім напружаньнем пры мінімальных запасах драўніны.

Адсюль, з самага пачатку навігацыі перад лесазагатоўчыкамі паўстала задача фарсаваць сплаў, скончыць яго да 1-га лістапада.

Нашы загатоўчыя арганізацыі ня справіліся са сваімі задачамі.

Навет зараз 100.000 куб. мэтраў дроўляных па прыстанях Прыпяці, Сожу і Дняпра, 10.000 куб. мэтраў лесу засталося ў Прапойску, 8.000 — у Лоеве і г. д. Звыш 400 тысяч кб. м. знаходзіцца ў дарозе. Навісла рэальная пагроза зімоўкі лесу ў вадзе, зацірання яго лёдам.

Лесбел, Саюзлес, кіраўніцтва сплаву ня здолелі перабудаваць сваёй работы, фарсаваць сплаў. Праца ня была паладжана круглыя суткі. Нічога ня было зроблена, каб мэханізаваць сплаў; дрэнна праводзілася вярбоўка рабочай сілы, не паладжан быў улік працы. Каапэрацыя агідна абслугоўвала плытагоны. З усіх вучасткаў чуліся скаргі, што Дняпроўскае дзяржпараходства праяўляе вузкае месьцішча, адмаўляецца даць баржы пад дровы, зрывае планы сплаву.

Такім чынам не «аб'ектыўныя» прычыны, а апартуністычная недаацэнка сплаву прывялі да прарываў на гэтым вучастку.

З 1-га лістапада, згодна пастановы ўраду, абвешчана дэкада надзвычайных дзеяньняў, дэкада фарсаванага сплаву. 10-га лістапада сплаў павінен быць скончаны.

Гэта ўдарная работа патрабуе надзвычайных мер, бальшавіцкіх тэмпаў, напружаньня ўсіх сіл і энэргіі.

Лесбел, кіраўніцтва сплаву павінны неадкладна ўвесьці работу на сплаве на працягу круглых сутак. Райвыканкомы нельга спыняцца перад абвяшчэньнем пагалоўнай працугжлавінкасьці, калі гэта патрэбна для скончэньня сплаву.

Вялікія абавязкі ўскладаюцца на надзвычайныя чацьвёркі, арганізаваныя па раёнах для фарсаваньня сплаву. Ад іх патрабуецца — разгарнуць вельмі шырокую работу па мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці вакол сплаву. Усе партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі раёнаў павінны лічыць сплаў адзнэй са сваіх важнейшых баявых задач.

Спажывецкай каапэрацыі трэба неадкладна кінуць на вучастні сплаву фонды прамтавараў і прадуктаў. Ад саюзу сельгаслесарабочых, які на працягу сэзону не разгарнуў шырокай масавай работы на сплаве, патрабуюцца максымальныя намаганьні для разьвіцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва на сплаве. Трэба прэміяваць лепшыя рабачкомы, лепшыя арцелі плытагонаў, ударнікаў сплаву.

Лесазаводам — Бабруйскаму камбінату, заводу «Калектыўная Праца», пільнім імя Халтурына трэба тэрмінова заняцца вылкчваньнем лесу, ліквідаваць заторы ля прыстаней, забясьпечыць яго людзьмі і коньмі.

Неабходна бязьлітасна ударыць па спробах кулацка-заможных элемэнтаў весьці агітацыю сярод адсталых груп плытагонаў, сарваць сплаў.

Усякую недаацэнку сплаву, усякую работу з «халадком» трэба разглядаць, як апартуністычныя адносіны да ўдарнай кампаніі дня; нядбайныя адносіны да сплаву павінны быць неадкладна ліквідаваны.

Улічваючы халаціцтвы мясцовых рабочых арганізацый, абмежаваны порыад, які застаўся да замарзкаў, неабходнасьць выкананьня пляну забесьпячэньня прамысловасьці драўнінай. Наркампрацы СССР са згоды ЦК адпаведных прафсаюзаў, дазволіў 7 і 8 лістапада праводзіць работы па нагрузцы і выгрузцы і сплаве драўніны.

Суботнік на сплаве павінен быць шырока скарыстаны для фарсаваньня работ.

Адпазчы сьвята Кастрычніка поўным выкананьнем праграмы сплаву.

Старыя песьні на новы лад

МАСКВА, 4. Выкрываючы здрадніцкую ролю правых і «левых» апартуністых і іх спробы згуртавацца для барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, «Правда» паказвае, што: «разьбітыя ў адкрытым бай, зараз правыя і «левыя» апартуністыя прабуюць скрыта атакаваць партыю, ужываючы самыя агідныя формы і метады барацьбы супроць партыі, супроць пралетарскай дыктатуры, супроць сацыялістычнага будаўніцтва. Але гэты рэванш таксама ня будзе мець посьпеху, як і ўсе рэваншы апазыцыйных груп, якія былі ў нашай партыі. Ніякія двурушніцкія і здрадніцкія прыёмы правых і «левых» апартуністых ня ўсыпляць пільнасьці партыі да новых манэўраў саюзьнікаў контр-рэвалюцыйных кандрацьцеўска-громанаўскіх груп. Партыя ведае пану заявам аб згодзе з пастановамі XVI зьезду «па сутнасьці» (з заявы т. Бухарына ў ячэйцы НДС). Партыя чыла і лічыць, што згода «па сутнасьці» азначае перш за ўсё актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні гэтых пастаноў і ў барацьбе з усімі, хто зрывае выкананьне гэтых пастаноў. У сьвятле сапраўдных паводзін лідэраў правай апазыцыі партыя мае ўсе падставы сказаць, што іх заявы аб згодзе з пастановамі XVI зьезду ў корані крывадушны. Вось чаму, — піша далей газета, — зусім натуральнымі і повальнымі зьяўляюцца патрабаваньні магутных партыйных арганізацый аб ужываньні да ўпартых апартуністых рашучых мер. Вось чаму ва ўпор ставіцца пытаньне перад кожным апартуністам аб сумленьні разбураючай работы супроць партыі. Невыкананьне гэтай умовы цягнула і будзе цягнуць за сабой неадкладнае выключэньне з партыі кожнага апартуністага-двурушніка, колькі-б ён пры гэтым фальшыва ни крычаў аб «адзінстве партыі» і аб сваёй згодзе з пастановамі XVI зьезду «па сутнасьці».

«Тав. І. Варэйкіс у артыкуле «Орудие кулацко-капиталистических ресторваторов», зьмешчаным у «Правде», выкрываючы ідэйную сувязь правых і «левых» апартуністых з контр-рэвалюцыйнай кандрацьцеўскай арганізацыяй, прыводзіць рад паказаньняў раньшых дзеячоў кандрацьцеўскай арганізацыі. Напрыклад, праф. Шпоў заявіў: «разьвіцьцё паказаных тэорый (тутэйш. ідэе аб кандрацьцеўскай тэорыі) і іх арганічная сувязь з правымі плынямі ва УсеКП(б), якія вызначыліся, стварылі умовы ўзасмнага падтрыманьня правага ўхілу ў групе Кандрацьцева, т. зн. гэта аграэканамічная школа лавала навукамадобныя довады для палітычнай лініі, на чале яго стаялі т. т. Бухарын, Рыкаў, Томскі, Фрумкін і інш., і пацьвярот — уплыў у партыі гэтых т. т. забясьпечваў правядзеньне ў жыцьцё ідэй групы Кандрацьцева». Другі праф. Мінін пацьвярджае, што погляды правых ухілістых супадалі з установкамі групы Кандрацьцева і пры практычным правядзеньні ў жыцьцё спрыялі захаваньню той экстэмічнай пазыцыі, на якой будавалася група Кандрацьцева». «Нам здавалася, —піша Мінін, — што установкі новай групы УсеКП(б) — Рыкава, Бухарына, Томскага, якія займалі выдатныя пасты ў партыі і савецкім апараце, зьяўляюцца даволі аўтарытэтнымі і імпануюць шырокім масам». Правыя ўхілістыя зказаліся ідэйнымі зброяносцамі кулацкай контр-рэвалюцыйнай партыі: «у заключэньне я прыходжу да вываду, што ўзаемаадносіны, якія ўстанавіліся паміж правым ухілам і групай Кандрацьцева, можна коратка фармуляваць вядомай прыказкай з некаторымі рэдакцыйнымі зьменамі: «Група Кандрацьцева біла ў свае званы, уважліва заглядаючы ў права-ўхілістскія сьвятцы». Мы прывялі толькі некаторыя вытрымкі, але іх было даволі для таго, каб відаць было, куды вялі і вядуць сваю лінію правыя ўхілістыя. Катэгарычныя патрабаваньні шырокіх партыйных мас да лідэраў правага ўхілу Бухарына, Рыкава і Тімскага вылянць свае адносіны да генэральнай лініі партыі, давесьці на справе правільнасьць сваіх абяцаньняў, якія даны партыі на XVI зьезьдзе — прымусілі выказацца ў ЦК толькі аднаго Бухарына. Але гэта заява Бухарына, зробленая ім у бюро ячэйкі НДС (навукова-дасьледчага савету) ня можа задаволіць партыю. Нездавальняючасьць гэтых заяў, — гаворыцца ў пастанове бюро Сакольніцкага РК УсеКП(б), — асабліва відавочна ў сувязі з тым, што т. Бухарын у сваім выступленьні на мітынгу НДС з нагоды шкодніцтва ні слова не сказаў аб правых, аб ідэалёгічным сваяцтве лініі правых з установкамі кандрацьцеўска-громанаўскага шкодніцтва, аб тым, што правыя ўнутры партыі аб'ектыўна зьяўляліся і зьяўляюцца рупарам. кандрацьцеўска-громанаўскіх ідэй, што т. Бухарын адмовіўся на фармальных матывах выступаць на агульным сходзе НДС на справе Руціна, між тым, як ён, будучы членам ЦК партыі, павінен быў выступіць на ячэйцы з абаронай лініі партыі. У сувязі з гэтым бюро Сакольніцкага райкому, асуджаючы палітычныя паводзіны т. Бухарына, як палітыку, якая на справе праводзіць установкі Руціна і зьяўляецца фракцыйнай, спаціць перад ЦК УсеКП(б) пытаньне аб ужыцьці да т. Бухарына пакаазаных зьездам самых рашучых арганізацыйных мер. Прэзыдыум ВККІ ў рэзалюцыі аб унутрыпартыйным становішчы ва УсеКП(б) вітае выключэньне з партыі выкрытых двурушнікаў і апартуністых Руціна, Сьлянкова, Марэцкага Нусінава, Каўрайскага і інш. і лічыць неабходным, каб усе ідэйныя патыпцелі праса-«левага» блёку былі прыцягнуты да суровага бальшавіцкага аднаго. («Правда»).

КАЛЕНІ РВУЦЬ ЛАНЦУГІ НЯВОЛЬНІЦТВА

ПАЎСТАНЬНЕ НА ВЫСЬПЕ ФАРМОЗА

УДУШЛІВЫЯ ГАЗЫ СУПРОЦЬ ПАЎСТАЎШЫХ

ТОКІЁ, 3. На высьпе Фармоза, згодна афіцыйных паведамленьняў, апошняя апора паўстанцаў — раён племені Махэба — заняты японскім войскам пасьля жорсткіх баёў, у якіх было забіта каля 80 студэнтаў. З боку японцаў забіта 5 салдат, адзін афіцэр і 6 паліцэйскіх, 11 паліцэйскіх пяжка паранены. Паводле заяў узятых у палон студэнтаў, каля 600 чал. паўстанцаў адступіла ў горы. Яны маюць запасы харчаў на два месяцы. Як паведамляе міністэрства калёній, распрацоўваецца пытаньне аб ужываньні «хэмічных сродкаў» для канчатковага задушэньня паўстаньня. Агенцтва Сімбун-Рэнга паведамляе аб сур'ёзных баёх, якія пачаліся паміж племям Фрэнх, якое да гэтага часу захавала нейтралітэт, і японскімі войскамі. (ТАСС).

Хваля паўстаньняў, якая пракацілася ў апошні час на ўсім калёніяльным сьвеце, дайшла і да японскай калёніі Фармоза.

Высьпа Фармоза мае для Японіі ня толькі эканамічнае, але і стратэгічнае значэньне. Насельніцтва высьпы перавышае 4 мільён. чал., пераважная большасьць кітайскага паходжаньня. Значная частка высьпы пакрыта каштоўнейшымі парадамі лесу. Акрамя таго, там багата расьце цукровы трасьнік, рыс ды інш. сельска-гаспадарчыя культуры, а таксама здабываюцца золата, медзь, каменны вугаль. Амаль увесь замежны гандаль высьпы знаходзіцца ў руках Японіі, для якой Фармоза зьяўляецца рынкам збыту японскіх прамысловых вырабаў.

Стратэгічнае значэньне Фармозы для японскага імпэрыялізму заключаецца ў тым, што яна знаходзіцца прыблізна на паўдарогі паміж Японіяй і Філіпінскімі выспамі, якія зьяўляюцца амэрыканскай калёніяй і на якія японскія імпэрыялісты даўно вострацць зубы. У выпадку вайны з Амэрыкай, Фармоза можа, такім чынам, служыць базай для японскага ваеннага флёту.

Падобна іншым імпэрыялістычным дзяржавам, японскія імпэрыялісты пільна ахоўваюць свае калёніі ад чужога зайздраснага вока і зьнешняму сьвету вельмі мала пядома аб тым, што робіцца ў гэтых краінах, пад уціскам японскага імпэрыялізму. У мэтадах прытрымваньня калёніяльных краін Японія навет імкнецца, і не бяз посьпеху, апярэдзіць іншых імпэрыялістых. Тубыльскае насельніцтва асуджана на поўнае беспраўе і самым жудасным нарадкам эксплёатуецца японскімі калёнізатарамі. Найменшае пралёўленьне рэвалюцыйнага руху душыцца самым зьверскім чынам.

І ўсё-ж, ні лютуючы ў японскіх калёніях ражым бізуна і палкі, ні паліцэйскія рагаткі ня ў стане абераргчы іх ад прасочваньня рэвалюцыйных ідэй. Рэвалюцыйныя падасі ў Кітаі і ў Індыі не маглі, зразумела, прайсьці біз сьледу для Фармозы, якая знаходзіцца недалёка ад іх, і можна з упэўненасьцю сказаць, што паўстаньне на Фармозе зьяўляецца вопчукам гэтых падзей. Японскае ваеннае міністэрства паведамляе, што пік удзельнікаў паўстаньня дасягае 15.000 чал. Аднак, навет мізэрныя весткі, якія паведамляе японскі ўрад, як напад паўстанцаў на паліцэйскія пасты, вялікая колькасьць вахвар, шляніцыя паўстанцамі нацыянальнага сьцягу і г. д. паказваюць на тое, што рух мае шырэйшы размах. Паўстаньне на Фармозе, якое зьяўляецца звяном у агульным ланцугу калёніяльных паўстаньняў, яшчэ раз пацьвярджае развал калёніяльнай «стабілізацыі», які назыбляецца сусьветным эканамічным крызісам.

Паўстаньне пралетарыяту ў Бразыліі

Барыкадныя вулічныя баі ў прамысловых цэнтрах

БЭРЛІН. Як паведамляе орган нямецкай кампартыі «Ротэ Фанэ», працоўныя масы Бразыліі ў цэлым радзе месц паўсталі супроць новай ваеннай дыктатуры, устаноўленай у разультаце дзяржаўнага перавароту. 27 кастрычніка ў Рыё-дэ-Жанэйро і іншых гарадох адбыліся барыкадныя баі. Пасьля першых мерапрыемстваў новай ваеннай дыктатуры, накіраваных супроць рабочых плянтацый кавы, батракі і зруйнаваныя дробныя арандатары ўзьнялі зброю супроць новых пёкаяў замежнага імпэрыялізму. 27 раніцою ў буйных гарадох пачаліся вулічныя баі. У баёх на баку паўставшых удзельнічалі некаторыя збунтаваныя батальёны войска і паліцэйскія атрэды. Афіцэры былі зьмкнуты ў казармы.

Перамогшы сваю замяшанасьць, урад тэрмінова сабраў войска, якое яшчэ засталося яму верным і накіраваў яго супроць рабочых, пусьціўшы ў ход найбольш сучасныя мэтады і сродкі вайны. Па барыкадах быў адкрыты моцны куляметны агонь. Авіятары пачалі скідаць бомбы над барыкадамі. З перадавых батарэй пачалася гарматная страляніна. Да вечару лік забітых рэвалюцыянэраў перавышаў сотню чалавек, але рабочыя ўсё-ж не здаваліся.

РЫХТУЙЦЕ

калгасны прыліў

ІМЯ XIII ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

Саўгасы, калгасы, раёны, змагайцеся за скончэньне зяблёва да Кастрычніцкіх дзён

Па кулаку, па яго агентуры--апартуністых--руйнуючы ўдар

Калгасны падарунак

Сяўба і зяблёва — СКОНЧАНЫ
Загатоўчы плян — ПЕРАВЫШАНЫ

ДЗЬВЕ НОВЫЯ С.-Г. АРЦЕЛІ, НАРОДЖАНЫЯ КАЛГАСАМ „ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН", УЗАРАЛІ СВАЕ МЕЖЫ Ў АДНУ КАЛГАСНУЮ БАРАЗНУ

Рапарт „Зьвязьдзе"

ЖЛОБІН, (Па тэлефону).

Калгас «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН», Жлобінскага раёну, рапартуе рэдакцыі «Зьвязды».

— «Мы, калгасьнікі с.-г. арцелі «Чырвоны Партызан» у падарунак 13-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі з посьпехам СКОНЧЫЛІ асеньнюю с.-г. кампанію. Гэта — рэзультат шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў нашым калгасе пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б. У часе ўборачнай кампаніі група калгасьнікаў аб'ядналася ў адну ўдарную брыгаду і сваім энтузіязмам і баявымі тэмпамі работы заразіла ўвесь калгас. АД АДНЭЙ УДАРНАЙ БРЫГАДЫ МЫ ПЕРАЙШЛІ ДА УДАРНАГА КАЛГАСУ. Усе калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і ўступілі ў змаганьне за тэмпы ўборкі, сяўбы, зяблёва і збожжазагатовак.

Увесь ураджай убраны за 14 дзён да тэрміну. Бульба і тэхнічныя культуры былі своечасова ўбраны. Пасьля мы ўзялі на грамадзкі буксір адставаўшы суседні калгас «III Інтэрнацыянал» і дапамаглі яму скончыць уборачную кампанію. Верасьнёўская адозва ЦК УсеКП(б) натхніла нас на яшчэ больш высокія тэмпы работы. Да 25 верасьня мы цалкам скончылі сяўбу азімых, выканаўшы пасеўны плян на ўсе 100 проц. і пераключыліся на правядзеньне зяблёва і збожжазагатовак.

Наш калгас абавязаўся да гадавіны Кастрычніка ва што-б там ні стала скончыць зяблёва, арганізаваўшы ў суседніх вёсках ворыва пад зяб у адну баразну. Рапартуем «Зьвязьдзе», што гэта задача ВЫКАНАНА НАМІ ДА ТЭРМІНУ. Посьпехі нашага калгасу і праведзеная растлумачальная работа сярод адзінаасобнікаў зрабілі сваю справу. Пасёлак Заводны аб'яднаўся ў адзін калектыў. Нашы суседзі — учарайшыя адзінаасобнікі, сёньня калгасьнікі, былога пасёлку Заводны разам з намі вышлі на калектыўнае зяблёва і УЗАРАЛІ СВАЕ ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ПАЛОСКІ ПАД ЗЯБ У АДНУ БАРАЗНУ. У вёсцы Карма, якая знаходзіцца амаль побач з намі, таксама арганізаваўся новы калгас. Гэты калгас шпарка разгортвае ворыва пад зяб у адну баразну і на сёньня—заўтра цалкам выканае плян першага калектыўнага зяблёва.

На гэтым мы ня спыняемся. Фарсуючы збожжазагатоўкі (мы ўжо выканалі збожжазагатоўчы плян на 120 проц.), мы зробім усё магчымае, каб злучыць гэту справу з далейшай арганізацыяй новага калгаснага прыліву. Мы будзем упарта з дня на дзень змагацца за заўтрашніх калгасьнікаў, якія сёньня яшчэ не знаходзяцца ў калектывах, за новы калгасны прыліў імя XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі».

КАЛГАСЬНІКІ С.-Г. АРЦЕЛІ «ЧЫРВОНЫ ПАРТЫЗАН».

20

ВЫНІКІ КАСТРЫЧНІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)Б

Даклад К. В. ГЕЯ

на сходзе менскага партыйнага актыву

Спачатку некалькі слоў аб тэй агульнай палітычнай устаноўцы, з якое выходзіў пленум ЦК КП(б)Б пры вынясеньні сваіх пастаноў.

Апошні пэрыяд адзначан асобнымі выпазкамі права-апартуністычных элемэнтаў — справа Руціна, справа Сьляпкова, падазронае маўчаньне тав. Бухарына.

Гэтыя факты сьведчаць аб узмацненьні дзейнасьці права-апартуністычных элемэнтаў, аб іх двурушніцкай здрадніцкай рабоце. Правы апартунізм праяўляецца ня толькі ў спробах весьці права-апартуністычную прапаганду, але і ў практычнай нашай рабоце.

Правые выконваюць сацыяльны заказ клясавага ворага

Мы маем рад права-апартуністычных скажэньняў партыйнай лініі, часткова такога роду права-апартуністычныя скажэньні мы маем у цэлым радзе гаспадарчых пытаньняў у галіне прамысловасьці. Нядаўна ў ЦК УсеКП(б) абгаворвалася пытаньне аб Донвугалі. Спэцыяльная камісія ЦК УсеКП(б) пад кіраўніцтвам т. Молатава выехала ў Данецкі басэйн з тым, каб там на месцы прапрацаваць пытаньне аб магчымасьці павялічэньня здабычы вугалю. Камісія ў часе сваёй работы сустрэла супраціўленьне гаспадарчага апарату Донвугалю часткова з боку нам. старшыні Донвугалю, які, выклікаючы да сябе гаспадарнікаў, патрабаваў, каб яны не згаджаліся на павялічэньне пляновага заданьня па здабычы вугалю, і згрымаўся малюнак, што ў той час, калі спэцыяльная камісія ЦК УсеКП(б) вядзе работу ў Данецкім басэйне па павялічэньні здабычы вугалю, адзін з кіруючых работнікаў Донвугалю арганізоўвае работу ў процівагу задачам, якія пастаўлены камісіяй ЦК УсеКП(б).

Вам вядома справа Ўсёхэмпрому. Там сабраліся старыя нашы знаёмыя па ЎсеЦСПС: тав. Томскі, тав. Лугавой і цэлая плеяда былых прафсаюзнікалістых, а зараз гаспадарнікаў — работнікаў.

Праўленьне Ўсёхэмпрому было заменена Цэнтральным Камітэтам партыі за свае мінімалістычныя ўстаноўкі. Праўленьне — старалася ўсю сваю работу праводзіць пад знакам «паменш, пацішэй, як-бы чаго-небудзь ня вышла».

Мы маем і ў БССР у галіне прамысловасьці асобныя праявы правага ўхілу на практыцы. Нядаўна зьнят з работы дырэктар Гомсельмашу. Гомсельмаш нядаўна пушчан у ход. Гэта прадпрыемства, якое толькі пачынае разгортваць сваю вытворчасьць. Магутнасьць Гомсельмашу вызначана ў 10 тыс. сіласарэзак у год, у сучасны-ж момант завод выпускае ўсяго каля 3 тысяч сіласарэзак. Дырэктар Гомсельмашу даў устаноўку захаваць на будучы год прадукцыйнасьць заводу ў такіх-жа разьмерах, якія завод мае ў бягучыя месяцы. Зразумела, што нашай элемэнтарнай задачай зьяўляецца на трэці год работы заводу дасягнуць поўнага скарыстаньня ўсёй вытворчай магутнасьці заводу.

„Пахавалі кулака" і „почили" на лаўрах

У нашай рабоце ў вёсцы мы таксама сустракаемся нярэдка з праявамі правага апартунізму на практыцы. Возьмем такі прыклад, як загатоўкі збожжа. У мінулым годзе збожжазагатоўкі былі скарыстаны для сканцэнтраванага ўдару па кулаку.

У гэтым годзе кулак некалькі патрапаны, некалькі тысяч кулакоў выселена, некалькі тысяч раскулачана, але кулак застаўся, кулак ня зьнішчан. У гэтым годзе рад партыйных арганізацый вёскі вельмі слаба, вельмі вяла, вельмі неахвотна бяруць у рукі зброю збожжазагатовак для ўдару па тэй частцы кулацтва, якая яшчэ засталася. У нас ёсьць даныя па асобных раёнах БССР, у якіх партыйныя арганізацыі пішуць аб тым, што на 5.000 сялянскіх гаспадарак ёсьць... адна кулацкая гаспадарка. Мы мелі выпадкі, калі работнікі паасобных раёнаў зусім адкрыта заяўляюць, што ў іх у раёне кулакоў няма і г. д. Зразумела, што падобнага роду апартуністычнае кіраўненьне вызвяіць капіталістычныя элемэнты вёскі, якія яшчэ ёсьць, нельга інакш назваць, як праявай правага апартунізму на практыцы.

Мы на радзе асобных фактаў пераконваемся, што нават у тых мясцох, дзе выяўляюць кулакоў, усё-ж націск спагнаньня з кулака цьвёрдага заданьня ў абавяковым парадку ў цьвёрда вызначэньня абавязковым тэрміны ажыцьцяўляецца вельмі вяла.

Якраз таксама лінія партыі на разгортваньне калгаснага руху, на яго разьвіцьцё скажаецца ў радзе мясцовых арганізацый устаноўкай на самацёк, упартым нежаданьнем падняць на свае плечы задачу разгортваньня калгаснага руху так, каб арганізаваць беднату, серадняка, стаць на чале руху, але, вядома, не паўтараючы памылак мінулага году, не зварачаючыся да нацыску, да адміністраваньня. Трэба кіраваць гэтым масавым рухам, не чакаючы самацёку ў росьце калгасаў, з тым, каб партыя стаяла на чале гэтага руху, арганізоўвала яго і кіравала ім.

Супроць праваапартуністычнай стаўкі на самацёк

Права-апартуністычная стаўка на самацёк вельмі пашырана ў паасобных зьвеньнях вясковай партыйнай арганізацыі і ставіць перад намі, у ліку аднаго з важнейшых вынікаў, задачу ўзмацненьня работы ў вёсцы. Аб тым, што правы апартунізм на практыцы, у практычнай рабоце ня зжыты, паказвае такое зьявішча, як адно з выступленьняў на пленуме Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, які нядаўна адбыўся.

Мы на пленуме ЦК КП(б)Б мелі выступленьне аднаго з сакратароў райкому тав. Нікіфарава, і ў гэтым выступленьні яўна чуўся папрок партыі, у гэтым выступленьні выразна адчувалася нявер'е ва ўзятыя намі тэмпы, нявер'е ў партыйныя ўстаноўкі.

Вось вэтульны сэнс выступленьня т. Нікіфарава: плян пасеўнай пачны немагчыма выканаць, плян загатовак бульбы немагчыма выканаць, плян збожжазагатовак перавыкананы, стаўка на разьвіцьцё калектывізацыі — няправільная. ЦК дае ўстуноўку — 20 проц. ахопу бядняцка-серадняцкіх двароў да 1 студзеня. Гэта ўстаноўка можа быць рэальна толькі ў тым выпадку, калі падвесьці канкрэтнае забесьпячэньне машынамі пад гэта.

І вось у гэтай барацьбе супроць тых плянаў, якія даюцца вышэйшымі ўстановамі — СНК, партыйнымі і гаспадарчымі арганізацыямі, — у гэтай заяве аб тым, што важнейшыя гаспадарчыя пляны немагчыма выканаць, мы чуем голас правага апартуністага, які вядзе барацьбу супроць тых тэмпаў сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, якія ажыцьцяўляе партыя. Пленум ЦК КП(б)Б даў адпор, заслужаны адпор выступленьню т. Нікіфарава, але, як відаць, гэта выступленьне сымптаматычна, як відаць, Нікіфараў у сваім выступленьні адбіў некаторыя настрої, якія маюцца ў паасобных зьвеньнях партыйнай арганізацыі на вёсцы.

Яшчэ ня зжыта „головокружение от успехов"

Правы апартунізм зьяўляецца на даным этапе галоўнай небясьпекай і прадастаўляе ня толькі ў форме спроб двурушніцкіх элемэнтаў весьці разлагаючую работу ў партыі, але і ў форме права-апартуністычнай практыкі ў рабоце асобных партыйных арганізацый, у галіне прамысловасьці і ў галіне сельскай гаспадаркі.

Ці ёсьць «левыя» загібы ў нас? Ці канчаткова мы выжылі гэту папасу? Думаю, што гэтага нельга сказаць. Асобныя «лева»-загібныя настрої, асобныя памылкі левага парадку маюць месца і зараз. Гэтыя памылкі, праўда, сустракаюцца радзей, яны менш яркі выяўлены, чым права-апартуністычная практыка, але ў асобных выпадках «лева»-загібныя настрої і «лева»-загібная практыка даюць сябе ведаць.

Мы, напрыклад, нядаўна зацікавіліся тым, як у Слуцкім раёне былі скіраваны сьпісы кулакоў. Накіраваная намі аўтарытэтная партыйна-савецкая камісія выявіла, што з часу пэрыяду «головокружения от успехов», з часу пачатку гэтага году, раёнам ня былі праверваны і пратлядженны рад памылак, якія былі дапушчаны ў пэрыяд «головокружения от успехов». Раённыя арганізацыі не працавалі над тым, каб выправіць тыя ўдары па серадняку, якія былі дапушчаны ў пэрыяд «головокружения от успехов».

І такім чынам, нават тая вялікая растлумачальная работа, якая праводзіцца партыяй (арт. т. Сталіна, пастанова ЦК УсеКП(б), пастановы пленумаў ЦК КП(б)Б, пастановы XIII зьезду КП(б)Б, пастановы XVI зьезду УсеКП(б) — уся гэта вялізарная растлумачальная і дырэктыўная работа кіруючых партыйных арганізацый прайшла міма кіраўніцтва Слуцкага раёну.

Гэты факт паказвае, што асобныя «левыя» загібы ня зжыты канчаткова, і мы ня можам лічыць сябе застрахаванымі ад таго, што ў асобных пластох партыйнай арганізацыі ня будзе мець месца паўтарэньне тых ці іншых памылак, якія былі дапушчаны ў пачатку гэтага году.

Вось кратка тая агульная партыйная ўстаноўка, якая выцякае з работы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б.

Пленум разгледзеў 3 наступных чарговых пытаньні: аб чарговых гаспадарчых задачах, аб узмацненьні раёнаў і пытаньне аб нацпалітыцы.

1. Чарговыя гаспадарчыя задачы

У галіне гаспадарчых задач мы маем вельмі хуткае прасоўваньне наперад. За мінулы год валавая прадукцыя прамысловасьці вырасла (у 1929-1930 г.) на 68 проц., у той час, калі паводле пяцігодкі быў намечан рост у 1929-30 г. толькі на 38 проц. Такім чынам, мы маем значнае перавышэньне пяцігадовага пляну.

У капітальнае будаўніцтва за мінулы год намі ўложана 44 мільёны р. у той час, як паводле пяцігадовага пляну было намечана 36,5 млн. р. Гэта значыць і на гэтым вучастку заданьні пяцігадовага пляну намі перавышаны.

Прырост рабочых за мінулы год складае 14 тысяч чал. (32 проц.) у той час, як паводле пяцігодкі прырост рабочай сілы прадугледжваўся толькі на 11 проц. Цяпер на лініі сельскай гаспадаркі.

Агрэмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі ў збожжазагатоўках г. г. дае нам змаль адну трэцюю частку агульнага ліку загатоўленага збожжа. Беспрацоўя ў нас няма — яно ліквідавана значна раней тэго тэрміну, які меўся на ўвазе ў намічэньні нашай пляновай работы.

Такім чынам, мы рухаемся вельмі шпаркімі тэмпамі, але ў той-жа час мы ня выконваем цэлага раду пляновых заданьняў, якія мы ставім перад сабою ўжо ў парадку пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня лёзунгу «пяцігодка за 4 гады». У прыватнасьці гаспадарчыя пляны апошняга году (на 1 кастрычніка) ня выкананы поўнасьцю, і ёсьць прарывы ў выкананьні прамфінпляну. Некалькі лічбаў. Процант колькаснага выкананьня прамфінпляну складае 95 — 96 проц. па валавой прадукцыі, павышэньне прадукцыйнасьці працы ёсьць прыблізна на 24 проц. (супроць 35 проц. гадавога пляну), зьніжэньне сабекошту каля 8 проц. (замест 11 проц.), што задана апошнім гадавым пляном. Відавочны рад прарываў, прарываў мінулага году, якія намі павінны быць ліквідаваны на працягу гэтага ўдарнага кварталу. Такім чынам задачы ўдарнага кварталу (кастрычнік — сьнежань 1930 г.) зьяўляюцца ў вышэйшай ступені адказнымі гаспадарчымі задачамі. Ад правільнага скарыстаньня гэтых 3-х месяцаў ударнага кварталу, ад вынікаў работы ў часе гэтых 3-х месяцаў залежыць вельмі і вельмі многае ў справе далейшага пасьпяховага прасоўваньня наперад.

Барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну

На жаль, адна з важнейшых задач гаспадарчае работы — выкананьне прамфінпляну цяпер на працягу першай часткі ўдарнага кварталу не паказвае рашучага пералому да лепшага. Той буйнейшы творчы ўздым рабочых мас, які зьявіўся водгукам на верасьнёўскую адозву ЦК УсеКП(б), недастатнова скарыстоўваецца партыйнымі арганізацыямі для разгортваньня барацьбы для выкананьня прамфінпляну на ўсім працягу ўдарнага кварталу і падрыхтоўкі да надыходзячага гаспадарчага году. Паказальнікі выкананьня прамфінпляну за кастрычнік пачынаюць унушаць небясьпеку па цэлым радзе прамысловых прадпрыемстваў.

Такім чынам першай задачай зьяўляецца: далейшая барацьба за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за ліквідацыю тых прарываў, якія мы мелі ў мінулым годзе. Нашы мэтады работы — ударніцтва, сац. спаборніцтва, вытворчыя манэўры, арганізацыя «сквозных» брыгад, выпрацоўка сустрэчнага прамфінпляну і г. д. — поўнасьцю і цалкам сябе апраўдалі.

У тых мясцох, дзе мы маем паспаблеўшае і ўпадак — гэта тлумачыцца тым, што адпаведныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі ня здолелі практычна накіраваць працоўны парыў рабочае клясы як для замацаваньня дасягнутых вытворчых посьпехаў, так і для далейшага настойлівага прасоўваньня ўперад. У нас часта бывае, што, убачыўшы дасягненьні, узрадуюцца і на радасьці... апускаюць рукі, спыняюць працаваць, а справа, якая спачатку пачала рухацца, зноў коціцца ўніз. Вытворчасьць любіць увагу і клопаты аб ёй. Нельга працаваць урыўкамі, нельга толькі ў дні прапрацоўкі адозвы ЦК УсеКП(б) разгарнуць значную масавую работу з тым, каб потым кінуць гэту важную справу. Наадварот, патрэбна разгарнуць штодзённую масавую работу, замацоўваючы дасягнутыя посьпехі і падрыхтоўваючы глебу для далейшай барацьбы за новае заданьне, за новыя дасягненьні ў галіне вытворчасьці.

Задачы асобага ударнага кварталу

У галіне прамысловасьці мы павінны скарыстаць ударны квартал для таго, каб закончыць распачаты ўлетку рад прамысловых будаўніцтваў. У дні Кастрычніцкіх сьвят мы павінны пусьціць у ход магілеўскую фабрыку штучнага шоўку і Асінбуд.

Мы павінны паставіць зараз задачу далейшага будаўніцтва саўгасаў.

У саўгасах зараз ідзе работа па пабудове раду сьвінарнікаў, абор і г. д.

Цяпер дазвольце перайсьці да пытаньня аб важнейшых задачах і кампаніях у галіне вясковай работы. Як мы з гэтымі задачамі спраўляемся? Апошняя зводка дала лічбу ў 93% выкананьня пасеўных плянаў. Гэта яшчэ няпоўнае, ня стопроцантнае выкананьне, а, наадварот, гэта амаль зрыў пляновых заданьняў. Гэтым самым мы ў далейшым створаем рад труднасьцяй у галіне разгортваньня работы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Іменна таму з яшчэ большай энэргіяй і ўздымам мы павінны зараз узяцца за ажыцьцяўленьне ворыва пад зяблева. Работа па ворыве пад зяблева вызначае разьмер пасеўнай плошчы вясны надыходзячага году і, па-другое — гэта работа ўжо зараз можа і павінна быць злучана з задачай далейшага моцнага калгаснага прыліву.

Мы, як я ўжо адзначыў, устанавілі сабе ліміт, прыкладную і арыентовачную лічбу ў справе выкананьня задач, якія зьвязаны з калектывізацыяй.

Арыентовачная лічба на 1-е студзеня (г. значыць да канца сучаснага кварталу) — ахапіць калгасамі 20 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Неабходна дабіцца АКТЫЎНАГА КІРАЎНІЦТВА прыпіваи у калгасы, які пачаўся і які ідзе, бліснучым чынам злучаючыся з задачай разгорнутага ворыва пад зяблева.

У галіне загатовак збожжа ў бягучым годзе мы выконваем досыць буйное заданьне — каля 13 міл. пудоў збожжа у той час, як у мінулым годзе загатоўкі збожжа намі былі выкананы ў 10 мільёнаў пудоў.

Ураджай бягучага году значна вышэйшы, чым у мінулым годзе. Гэта дае нам усе магчымасьці для поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак. На 25-е кастрычніка мы мелі па збожжазагатоўках каля 46 проц. выкананьня гадавога пляну. Работа па збожжазагатоўках, бязумоўна, магла-б ісьці лепш, але асаблівай трывогі гэта лічба ў нас не выклікае. Значна горш, напружаней і вастрэй стаіць задача як з загатоўкамі, так і з вывазкай бульбы. Мы маем заданьне загатовіць 35 млн. пудоў бульбы (супроць 19 міл. мінулага году), пры чым мы павінны вывезьці 15 міл. пуд. супроць 6 міл. леташняй вывазкі. Такім чынам напружанасьць на фронце загатовак бульбы нам прадстаіць большая, чым у мінулым годзе ў той час, як выкананьне пляну загатовак бульбы у нас ідзе значна слабей. Паводле апошніх даных па БССР загатавана 24 проц. гадавога пляну бульбы, ці ўсяго каля 35 проц. асеньніх загатовак. Улічваючы, што бульбу можна загатовіць толькі да пачатку замаразкаў, улічваючы, што засталіся лічаныя дні да пачатку марозу (пры ўмове, калі замаразкі пачнуцца нармальна), — тэмпы загатовак павінны быць значна ўзмоцнены.

У асеньнюю кампанію з БССР неабходна пагрузіць і адправіць у прапетарскія цэнтры 170 тыс. тон бульбы. Мы на сёньняшні дзень адгрузілі толькі 84 тыс. тон (каля 51 проц.).

Часу засталося мала.

Працаваць патрэбна надзвычай напружана. Становішча з загатоўкай бульбы прымушае біць трывогу. Патрэбна мабілізаваць усю партыйную арганізацыю на тое, каб па-бальшавіцку націснуць у першую чаргу на выкананьне заданьня па загатоўках бульбы і поўнасьцю выканаць адказную задачу забесьпячэньня пралетарскіх цэнтраў Савецкага Саюзу бульбай.

Мабілізуем усе вольныя сродкі на сацыялістычнае будаўніцтва

Важнейшай гаспадарчай задачай зьяўляецца мабілізацыя фінансавых сродкаў насельніцтва. Па радзе прычын у вёсцы, у сялянства накапілася значная частка грошай і тэзаўрыраваных грошы мы павінны па радзе каналаў «отсасывать» з тым, каб мець магчымасьць выплачваць заработную плату з тым, каб мець магчымасьць не за кошт эмісіі, а за кошт нормавага грашовага звароту праводзіць усе неабходныя нам работы. І ў гэтай важнейшай галіне мы працуем яўна нездавальняюча. Мы склалі плян, у якім улічаны ўсе тыя крыніцы, па якіх павінны паступаць грошы з вёскі (падаткі, распаўсюджаньне пазыкі, усялякія паянакапленьні ў сельска-гаспадарчай каапэрацыі, паянакапленьні ў спажывецкай каапэрацыі, судавапэрацыі і г д.). Паводле гэтага пляну ў кастрычніку ў нашы касы павінна было паступіць 38 міл. руб. Але фактычна да сучаснага моманту паступіла ўсяго каля 14 міл. рублёў. Гэтыя лічбы кажуць аб разрыве і невыкананьні пляну, прычым асабліва значны прарыў у галіне мабілізацыі грашовых рэсурсаў ёсьць па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі, якая ня выконвае заданьняў па паянакапленьні, ня выконвае і раду іншых адказных заданьняў. Кепска таксама ідзе справа з распаўсюджаньнем пазыкі на вёсцы. У той час, як у горадзе падпіска праведзена больш-менш пасьпяхова, на вёсцы распаўсюджаньне пазыкі ідзе слабей; наш калгасьнік у сваёй масе ня стаў яшчэ тым агітатарам, які-б агітаваў за пазыку і распаўсюджваў яе сярод адзіноасобных гаспадарак.

Падрыхтоўка кадраў--асноўная задача гаспадарчых органаў

Мы ўступілі ў такі пэрыяд, у такую паласу, калі падрыхтоўка рабочай сілы, павышэньне яе кваліфікацыі і забесьпячэньне нашых прадпрыемстваў пастаянымі кадрамі зьяўляецца асноўнай задачай гаспадарчых органаў. У сувязі з гэтым мне хочацца асабліва падкрэсьліць памылку, блізарукасьць нашых гаспадарчых органаў, якую яны дапусьцілі тым, што не скарысталі сродкаў, адпушчаных на ўтварэньне школ фабзавучаў.

Турботы аб тым, каб разгарнуць рад школ, тэхнікумаў, якія падрыхтоўваюць рабочую сілу, ажыцьцяўленьне раду мерапрыемстваў, забясьпечваючых сталы кантынгент рабочай сілы на даным прадпрыемстве — зьяўляецца пытаньнем, над якім нам усім прыдзецца напружана працаваць.

Вось асноўныя гаспадарчыя задачы, над вырашэньнем якіх пленум працаваў.

2. Тварам да раёнаў

Пленум ЦК КП(б)Б таксама разгледзеў пытаньне аб умацаваньні раёнаў. Дрэнна, ці добра мы справіліся з задачай у разьмеркаваньні акруговых працаўнікоў, але ўсё-ж некаторыя сілы ў раён прыбылі — па 5-6 работнікаў раёны атрымалі. Ацэньваючы нашу работу ў сэнсе разьмеркаваньня акруговых працаўнікоў, трэба зазначыць, што мы досыць жорстка ажыцьцявілі лінію ў адносінах разьмеркаваньня «20» — дваццаці кіруючых працаўнікоў акругі. У выніку 90 проц. фактычна выехала ў раёны і там працуе, што-ж датычыць рэшты акруговага актыву, дык тут сёй-той у нас з рук высьлізнуў, і нам прышлося спэцыяльна накіраваць нашым буйнейшым цэнтрам спэцыяльных таварышоў для падшуканьня спраднягa актыву для пасылкі ў раёны. Ня гледзячы на параўнаўча адавальняючае выкананьне разьмеркаваньня «20», раёны ўсё-ж націскаюць на нас у адносінах прысылкі новых работнікаў досыць моцна: 70 раёнаў зрабілі заяўку на 500 чал., прычым патрэбна зазначыць, што часта заяўкі не абмеркаваны і не прапрацаваны, і мы, вядома, поўнасьцю гэтыя запатрабаваньні задаволіць ня можам.

Пленумам пастаўлена пытаньне аб неабходнасьці ў раёнах больш рашуча высоўваць мясцовых работнікаў на кіруючую работу. Намі пастаўлена пытаньне аб неабходнасьці стварэньня надраў з калгаснікаў, надраў саўгасных рабочых. У сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі разьвіваюцца і растуць новыя маладыя энэргічныя сілы, якія намі недаволі вылучаюцца на кіруючую работу.

Мы павінны былі на пленуме гаварыць і аб пабудове работы раёнаў. Пасьля ўсёй рэарганізацыі работа раённых камітэтаў партыі палепшылася. Але паасобныя раённыя камітэты партыі ў радзе выпадкаў яшчэ не ўявілі важных гаспадарчых і палітычных задач, яшчэ часта праяўляюць у падыходзе да гэтых пытаньняў вузкую містычную думку, да раду пытаньняў падыходзяць як спэцыфічныя раённшчыкі ў самым горшым сэнсе гэтага слова.

Значна большая самадзейнасьць, значна большая адказнасьць, ускладзеная на РК КП(б)Б у сувязі з ліквідацыяй акруг, значна большыя магчымасьці работы ў раёне — усё гэта патрабуе больш шырокага кругазору, больш шырокага партыйнага падыходу да гэтых пытаньняў. Раённы пункт гледжаньня зараз не падыходзіць ў раёнах (сьмех).

Калі некаторыя раёны ўжо зараз паказваюць па цэлым радзе заданьняў блыскучую работу (стопроцантнае выкананьне пасеўнага пляну, стопроцантнае выкананьне загатоўчага пляну і г. д.), дык разам з гэтым ёсьць рад раёнаў, якія ганебна цягнуцца ў хвосьце, зрываючы нам агульна-рэспубліканскае выкананьне важнейшых палітычных кампаній. У прыватнасьці пераважная частка райкомаў КП(б)Б не зразумела яшчэ да гэтага часу адной з асноўных палітычных задач сучаснага моманту — гэта пытаньня аб працы з беднатой. Вельмі многія раёны не ўявілі сабе, што пасьпяховае выкананьне пастаўленых перад намі гаспадарчых задач залежыць ад таго, у якой ступені партыйныя арганізацыі змогуць арганізаваць і згуртаваць вакол сябе беднату, у якой ступені змогуць яны праз беднату падняць і актывізаваць серадняка.

Абмеркаваньне пытаньня аб узмацненьні раёнаў выявіла таксама буйнейшыя дэфэкты ў рабоце цэнтральных устаноў БССР. Было шмат скаргаў раённых работнікаў (і скаргаў зусім правільных) на тое, што цэнтральныя рэспубліканскія органы ў сваёй рабоце таксама яшчэ не перабудаваліся і не прыстасаваліся да раёнаў. У рабоце наркаматаў усё яшчэ панае «цыркуляршчына». Цыркуляры пішуцца ў надзвычай вялікай колькасьці старонак. Напісаць абежнік і разаслаць яго ва ўсе раёны — гэта ў нас рабіць уменьне, але раённым работнікам ад гэтага часта не лягчэй бывае працаваць.

Нашы наркаматы яшчэ ня ўмеюць канкрэтна дапамагчы раённым камітэтам, даць канкрэтныя, жывыя і сапраўды практычныя паказаньні. І калі пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б пакрытыкаваў работу цэнтральных устаноў, падкрэсьліўшы неабходнасьць найхутчэйшай перабудовы форм і мэтадаў кіраўніцтва, яго большую канкрэтнасьць і эпэрацыйнасьць, неабходнасьць выпрацоўкі канкрэтных задач для кожнага раёну, выходзячы з уліку ўсіх асаблівасьцяй кожнага раёну, то пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б зрабіў канкрэтную справу.

3. Пытаньне нацпалітыкі

Зараз аб адным з найбольш важных па сваёй палітычнай сутнасьці пытаньні, якое стаяла на пленуме, — аб пытаньні нацыянальнай палітыкі. Па-першае, пленум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б яшчэ раз падкрэсьліў пастанову XVI зьезду УсеКП(б) аб тым, што «на даным этапе галоўнай небясьпекай зьяўляецца вялікадзяржаўны шавінізм».

Пленуму Цэнтральнага Камітэту трэба было адказаць на пытаньне так — ці правільна гэта ацэнка XVI зьезду партыі ва ўмовах Беларусі, ці ўжытна яна да ўмоў БССР, ці мы можам ад сябе тут у нас даць які-небудзь другі кірунак гэтаму пытаньню?

Асноўнае вырашэньне нацыянальнага пытаньня заключаецца ў тым, каб паскорыць ад тых матар'яльных і культурных няроўнасьцяй у становішчы народнасьцяй Саюзу, якія створаны палітыкай царскага ўраду, палітыкай буржуазіі, палітыкай прыгнечаных нацыянальнасьцяй.

У выніку гэтай палітыкі прыгнечан рад нацыянальнасьцяй, ня было культурнага будаўніцтва, было значнае эканамічнае і культурнае адставаньне. Пазбавіцца гэтай спадчыны мінулага — адна з асноў у вырашэньні нацыянальнага пытаньня.

Мы ідзем бальшавіцкім шляхам у вырашэньні нацыянальнага пытаньня. Тэмпы гаспадарчага разьвіцьця, частка ва тэмпы разьвіцьця прамысловасьці ў нас, ў БССР, значна вышэй агульна-саюзных тэмпаў. Мы даганяем Савецкі Саюз, мы падцягваемся да матар'яльнага, гаспадарчага і культурнага ўзроўню, на якім стаіць Савецкі Саюз. Але ці можам мы сказаць, што мы ўжо пазбавіліся матар'яльнай адсталасьці, што пазбавіліся гаспадарчай няроўнасьці. Не, гэтага мы пакуль што ня можам сказаць. Па гэтым шляху мы ідзем, але гэту задачу не ажыцьцёвім, бо задача для свайго вырашэньня патрабуе раду гадоў, патрабуе доўгай работы.

Мы праводзім і будзем праводзіць лінію на разгортваньне культурнага будаўніцтва ў нацыянальных абласьцях і рэспубліках раней прыгнечаных нацыянальнасьцяй.

Але ці можам мы сказаць, што задача пабудовы нацыянальнай культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, намі ва ўмовах БССР ужо выканана. Не, гэтага мы ня можам сказаць.

Разглядаючы пытаньне, мы на пленуме адзначылі, што пралетарскі зьмест будуючайся нацыянальнай культуры ў нас далёка не заўсёды забясьпечан і што ў цэлым радзе важнейшых галін культурна-нацыянальнага будаўніцтва, у цэлым радзе галін навукі мы маем поўнае, амаль непадзельнае панаваньне людзей з буржуазным мысьленьнем, панаваньне буржуазных ідэй.

Вялікадзяржаўны шавінізм—галоўная небясьпека на даным этапе

У той час, калі мы разьвязваем нацыянальную праблему і разьвязваем з посьпехам, у той момант, калі мы падцягваем адставаўшыя раней вобласьці рэспублікі да агульна-саюзнага ўзроўню, матар'яльнага і культурнага жыцьця, калі мы разгортваем работы па будаўніцтве нацыянальнай культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце, калі мы яшчэ гэтага будаўніцтва не закончылі і не разгарнулі яго належным чынам, не напоўнілі яго патрэбным пралетарскім зьместам, — зьмяняць пастаноўку нацыянальнага пытаньня, агульную пастаноўку, даную яшчэ XII зьездам партыі і пацьверджаную XVI зьездам УсеКП(б) (яшчэ XII зьезд партыі паставіў пытаньне аб тым, што вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца асноўнай перашкодай, якая выклікае і актывізуе мясцовы нацыяналізм) — у гэты момант мяняць пастаноўку нацыянальнага пытаньня азначала-б паставіць далейшае нашае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў нацыянальных рэспубліках у вельмі цяжкія ўмовы.

Акрамя таго, улічваючы спэцыфічныя асаблівасьці БССР, мы павінны былі ўлічыць і тое, што партыйная арганізацыя, як правіла, параўнаўча слаба падкавана на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам. Калі мы параўнаем становішча справы ў нас з становішчам справы ва УССР, дык убачым, што там вялікадзяржаўны шавінізм ахінуўся ў такія формы, якія выклікалі адпор усёй партыйнай арганізацыі. З заявамі ў вялікадзяржаўным шавіністычным духу выступалі ў свой час на Украіне такія выдатныя работнікі, як Пятакоў, Зіноўеў, выступаў адзін з тагочасных сакратароў ЦК КП(б)У т. Лебедзь. Партыйная арганізацыя ў барацьбе з іх поглядамі павінна была мабілізаваць усіх членаў партыі для барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам. У нас вялікадзяржаўны шавінізм ніколі не выступаў у асобе такіх адказных кіраўнікоў партарганізацый, у нас прыходзілася весьці барацьбу з асобнымі праявамі, больш дробнымі праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму. На гэтых больш дробных замаскаваных праявах вялікадзяржаўнага шавінізму, вядома, цяжэй канцэнтраваць і мабілізаваць увагу партыйнай арганізацыі.

Нарэшце, пры разьвязваньні гэтага пытаньня мы выходзілі з таго, што ў сувязі з тым, што нацыянал-дэмакратызм канчаткова выявіў свой контр-рэвалюцыйны твар, мы можам мець узмацненьне вялікадзяржаўнага шавінізму, мы будзем, мусіць, мець спробы гэтых вялікадзяржаўных шавіністычных элемэнтаў узяць пэўны рэванш, прадставіць нашу барацьбу з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам у такім асьвятленьні, што нібыта актывізацыя гэтых контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў сьведчыць аб правале ўсёй лініі партыі ў нацыянальным пытаньні. Такі рэванш вялікадзяржаўныя шавіністыя прабуюць атрымаць, і таму перад тварам поўнага вынырыцьця дзейнасьці беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму асаблівую ўвагу набывае тэзіс аб тым, што вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе.

Не паслабляць барацьбы з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, з шавінізмамі ўсіх колераў

Вядома, гэта ні ў якай ступені не азначае аслабленьня барацьбы супроць шавінізму беларускага, г. ё. супроць контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, ні ў якай ступені не азначае аслабленьня барацьбы з праявамі шавінізму яўрэйскага, польскага і г. д.

Падругое, трэба спыніцца на тэй характарыстыцы нацыянал-дэмакратызму і нацыянал-апартунізму, якая дана ў рашэньнях пленуму. Да характарыстыкі нацыянал-дэмакратызму, як такавога, як вызначанай палітычнай контр-рэвалюцыйнай плыні, пленум асабліва новых рыс унесьці ня мог. Нам даўно вядома тая сума ідэй, якія мае беларускі нацыянал-дэмакратызм. Гэта перш за ўсё нацыяналізм, гэта перш за ўсё ў сваёй аснове буржуазная ідэалёгія, якая прыкрываецца агульнанацыянальнымі інтарэсамі і ў мэтах абагульненьня сваіх буржуазных клясавых ідэй яны прабуюць схаваць свой твар за вучэньнем аб «адзінстве нацый».

Асноўнай ідэяй, выходным пунктам ідэалёгіі нацыянал-дэмакратызму зьяўляецца сьцьвярджэньне аб тым, што беларусы — гэта адзіная нацыя адзінага працоўнага сялянства, з некаторым лікам рамесьнікаў, існаваўшага на працягу раду вякоў, зьяўляючыся хавальнікам беларускага нацыянальнага ідэалу і нацыяналістычная інтэлігенцыя толькі прышла на службу «адзінай працоўнай сялянскай нацыі», напісаўшы на сваім сьцягу лёзунгі «адрадканізму» і г. д. Гэтыя ідэі вельмі выразна выяўлены ў працах небезьвядомага ў БССР гісторыка Доўнара-Запольскага, які нават ухітрыўся Кастрычніцкую рэвалюцыю ацаніць такім чынам, што паводле Доўнар-Запольскага атрымалася, што Кастрычніцкая рэвалюцыя ёсьць перамога працоўнага сялянства, перамога сялянства наогул, а не рабочай клясы.

Мы ведаем, што беларускі нацыянал-дэмакратызм арыентаваўся на капіталістычны Захад у процівагу пралетарскай Маскве і часткова арыентаваўся на буржуазную Польшчу. Гэтае арыентаваньне зьвязвалася ў поўнай меры аформленым імкненьнем да стварэньня беларускай народнай «рэспублікі», якая ў нашых умовах, на данай ступені разьвіцьця імпэрыялізму, была-б ні чым іншым, як дыктатурай фашызму. У радох нацыянал-дэмакратызму быў і «самабытніцкі», і «незалежніцкі» струмень, які то ўзмацняўся, то паслабляўся.

Коратка, справа сярод нацыянал-дэмакратаў з заходняй арыентацыяй, з арыентацыяй на фашысцкую Польшчу, і справа з самабытнасьцю стаяла прыкладна так: узмацняюцца надзеі на ўнутраны пераварот, на кулацкае паўстаньне ўнутры БССР — узмацняецца «самабытніцкае» крыло нацыянал-дэмакратызму; калі-ж надзеі на кулацкае паўстаньне паслабляюцца, дык узмацняюцца надзеі на польскую інтэрвэнцыю, узмацняецца заходняя арыентацыя, паслабляецца «самабытніцкае» крыло.

Як-бы там ні было, гэтыя дзьве тэндэнцыі найлепшым чынам мірна ўжываюцца і прадстаўлялі з сябе дзьве розданасьці аднэй

Даклад тав. ГЕЯ

Працяг. Пачатак глядзі на 2-й старонцы.

Зьнішчым прарывы ў беларусізацыі

Без такога рашучага зруху ў рабочых масах нашы спробы ажыцьцявіць партыйнае кіраўніцтва справай будаўніцтва культуры зьявяцца гмахам, які пабудаван на пяску.

Рабочая кляса ў БССР, як вядома, складаецца толькі на палову з беларусаў, а другая палова рабочых складаецца з яўрэяў і рускіх.

Як мы можам патрабаваць ад яўрэйскага, ад рускага рабочага, нават ад рабочага-беларуса, які забыў сваю мову і адвык ад карыстаньня беларускай мовай, як мы можам ад яго патрабаваць ужываньня беларускай мовы?

У нашай партыі пытаньне гэтае вырашана і пленум ЦК КП(б)Б толькі зафіксаваў тую лінію, якую і ў далейшым будзе праводзіць партыя ў гэтым пытаньні. Прымусовая беларусізацыя рабочых мас недапушчальна.

Беларусізацыя рабочых мас можа праводзіцца толькі на поўнасьцю добраахвотным пачатку. Партыі патрэбна ў яшчэ большай меры правесьці ў рабочай клясе растлумачэньне неабходнасьці аўладаньня беларускай мовай, неабходнасьць ажыцьцяўленьня беларусізацыі, як сродку, які ва ўмовах БССР замацоўвае дыктатуру пралетарыяту, замацоўвае кіруючую ролю рабочае кляссы, яе саюз з асноўнымі масамі сялянства.

Зьнішчыць прарывы ў справе беларусізацыі і прасунуць уперад беларусізацыю, паставіць на неабходную вышыню вывучэньне гісторыі і эканоміі, разьвіць зацікаўленасьць да гэтых пытаньняў у партыйным і беспартыйным асяродзішчы — вось тыя асноўныя вывады, той комплекс мерапрыемстваў, той шлях, па якім павінна пайсьці партыя.

Зразумела, што з пастаноў пленуму выцякае неабходнасьць чысткі радоў КП(б)Б ад прагніўшых апартуністычных элемэнтаў.

У прыватнасьці пленум ЦК прыняў пастанову аб вывадзе т. Ігнатоўскага са складу членаў бюро ЦК і са складу ЦК КП(б)Б і перадаў у ЦКК пытаньне аб магчымасьці застаўленьня Ігнатоўскага ў радох партыі. Пленумам прыняты таксама вядомыя вам пастановы ў адносінах да тав. Васілевіча. Матывы гэтых рашэньняў зразумелы з пастаноў пленуму ЦК, якія даведзены да вашага ведама.

Зразумела, гэтымі мерапрыемствамі задачы чысткі ня вычэрпваюцца. Цэнтральны Камітэт ставіць сваёй задачай праводзіць і ў далейшым пасьлядоўную і рашучую чыстку нашых радоў і спадзяецца, што ў гэтай рабоце будзе мець поўнае аднадушнае падтрыманьне ўсёй партыйнай арганізацыі.

4. За цьвёрдае ленінскае адзінства

Мне здаецца, што на гэтым я магу скончыць.

З посьпехам ажыцьцяўляць нацыянальную палітыку магчыма толькі пры ўмовах ПОЎНАГА АДЗІНСТВА І ПОЎНАЙ ЗГУРТАВАНАСЬЦІ ЎСЁЙ НАШАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Усякая шчыліна, усялякія згрызоты, усялякая антыпартыйная пастаноўка пытаньня, выпадковая, непрынцыповая пастаноўка пытаньня заўсёды будзе скарыстана тым ці іншым відам шавінізму, заўсёды будзе скарыстана тэй ці іншай рознавіднасьцю нацыянал-апартунізму, якая імкнецца забіць клін у кожную шчыліну, якая-б маленькая гэта шчыліна ня была. Таму Цэнтральны Камітэт заклікае вас да захаваньня ленінскага адзінства партыі ў бязьлітасным барацьбе супроць усялякіх рознавіднасьцяй апартунізму і нацыяналізму (апёдысмэнты).

Біць па ўсялякіх спробах рэвізаваць лінію партыі справа і „зьлева“

З бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю і непрымірымасьцю весьці непаслабнае змаганьне супроць правых і „левых“ апартуністых, нацыянал-апартуністых і прымірэнцаў да ўхілаў ад ленінізму

Пленум ЦК КП(б)Б адбыўся напярэдадні сьвяткаваньня XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. У XIV гадавіну свайго існаваньня Савецкі Саюз уступае з гіганцкімі посьпехамі па індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. БССР, як непаўрная частка вялікага Савецкага Саюзу, сустракае сьвята XIII Кастрычніка адкрыцьцём новых фабрык і заводаў, арганізацыяй новых калгасаў, яшчэ большым павышэньнем актыўнасьці рабочых мас, калгаснікаў, бедняты і сераднякоў-адзінаасобнікаў. Гэтыя посьпехі, рост актыўнасьці пралетарыяту і шырокіх мас працоўнага сялянства сталі магчымымі толькі таму, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, шчыльна ажыцьцяўляла генэральную лінію партыі, бязьлітасна змагалася супроць правых і «левых» апартуністых, якія імкнуліся сьцягнуць партыю з правільнага шляху ва ўгоду клясавым варожым капіталістычным элемэнтам.

Наперакор прадраканьням правых апартуністых, тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ўсё павышаюцца. На БССР валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці ўзрасла на 86 проц. Гэты рост перавышае плянавыя меркаваньні, якія вызначаліся ў адносінах росту валавое прадукцыі. Капітальнае будаўніцтва прамысловасьці выканана на суму 44 млн. руб. між тым, як, паводле пяцігодкі, меркавалася ўкласьці ў капітальныя работы ў 1929-30 годзе 38,4 млн. руб. Колькасьць рабочых узрасла па 82 проц. супроць 11 проц., якія прадугледжваліся пяцігодкай, што дазволіла ліквідаваць беспрацоўе.

У разьвіцьці сельскай гаспадаркі вынікі 1929-30 г. сьведчаць аб значным уздыме сельска-гаспадарчай вытворчасьці і павялічэньні ролі агрэгаманага сэктару. Плошча пад калгасамі і саўгасамі вырасла да 20 проц., прычым роля агрэгаманага сэктару сельскай гаспадаркі ў збожжазагатоўках узрасла з 1,7 проц. у мінулым годзе да 25-30 проц. у бягучым годзе.

Дзякуючы таму, што КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, няўхільна змагалася за ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, супроць беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, супроць нацыянал - апартунізму і шавінізму усіх колераў, набыты буйныя посьпехі на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Калі да рэвалюцыі на тэрыторыі БССР ня было зусім нішчэйшых навучальных устаноў, то зараз мы маем 12 ВНУ і ВТНУ. Аб культурным росьце выразна сьведчыць і той факт, што за адны толькі 8 месяцаў бягучага году выпушчана 26 млн. друкаваных аркушаў літаратуры на беларускай мове.

Ніжэйшая і сярэдняя школы працуюць на беларускай мове. Мы ня будзем хаваць аб тым, што як цэнтральны, так і мясцы партыйны, савецкі, гаспадарчы, прафсаюзны апараты перавялі сваю работу на беларускую мову.

Безумоўна, ва ўсёй гэтай рабоце ёсьць еще недахопы, якія зявяліся ў выніку таго, што ня ўсе пізавыя партыйныя ячэйкі здолелі стаць на чале актыўнасьці мас і накіраваць яе на павышэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Работы пленуму ЦК КП(б)Б, які падсумуе працу на гаспадарчым фронце і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва, праходзілі ў той перыяд, калі праваапартуністычныя элемэнты пачалі актывізаваць сваю дзейнасьць, накіраваную супроць партыі і яе бальшавіцкага ЦК, калі правыя апартуністыя блёкуюцца з «левымі» контррэвалюцыйна - трацкісцкімі элемэнтамі для новых атак супроць генэральнай лініі партыі. Уся работа пленуму праходзіла пад знакам непрымірымай барацьбы за ленінскую лінію партыі. Высока - палітычная прынцыповасьць зьместу пастаноў пленуму, які выходзіць з асноўнай задачы змаганьня за генэральную лінію партыі, за лінію яе бальшавіцкага ЦК УсеКП(б), за непарушнае адзінства бальшавіцкіх радоў, накіраваны на забесьпячэньне хутчэйшага і поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і пастаноў XIII зьезду КП(б)Б, на ўзмацненьне сацыялістычнага наступленьня на ўсім фронце.

На ўсіх партыйных арганізацыях пачалася прапрацоўка пастаноў пленуму. На сходах партыйных актываў буйнейшых партарганізацый: Менскай, Гомельскай, Віцебскай і інш., на сходах актываў раду раённых партарганізацый вёскі былі заслуханы даклады аб выніках работ, аб пастановах пленуму ЦК КП(б)Б. **Пастановы пленуму,** накіраваныя на бязьлітаснае змаганьне супроць агентуры варожае класы — правых і «левых» апартуністых, супроць падсобнікаў контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, нацыянал - апартуністых і прымірэнцтва да ўхілаў ад ленінізму; пастановы, накіраваныя на павышэньне тэмпаў сацыялістычнай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі і на яе аснове на ліквідацыю кулацтва, як клясы, — **знайшлі поўнае падтрыманьне і ўхвалу з боку самых шырокіх партыйных мас.** З бальшавіцкай аднадушнасьцю ўхваляючы пастановы пленуму, партыйныя масы запэўняюць свайго калектыўнага кіраўніка — ЦК КП(б)Б,—што гэтыя пастановы ў іх практычнай рабоце будуць няўхільна праводзіцца ў жыцьцё.

Сход партыйнага актыву буйнейшай у КП(б)Б **Менскай арганізацыі,** абмеркаваўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Гея аб выніках пленуму ЦК, у аднагалосна прынятай рэзалюцыі далкам і поўнасьцю далучыўся да ўсіх пастаноў 2-га пашыранага пленуму ЦК КП(б)Б і канстатаваў, што **«пастановы пленуму ЦК зьяўляюцца стымупам для далейшай напружанай барацьбы за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, узбройваюць партыю на рашучую барацьбу з правым і «левым» апартунізмам і нацыянал-апартунізмам, а таксама і прымірэнцтвам да ўсіх відаў апартунізму».** Разам з гэтым партактыў аднадушна ўхваліў меры, якія ўжыў пленум у адносінах да тав. **Васілевіча,** а таксама вывад са складу бюро ЦК і члену ЦК **Ігнатоўскага,** які, будучы на кіруючай рабоце ў Акадэміі Навук, груба скажаў лінію партыі.

Каля 15 таварышоў, якія выступалі на сходзе партактыву па дакладу т. Гея, аднадушна ўхвалялі пастановы ЦК, падкрэсьлівалі тую грандыёзную работу, якую правяла КП(б)Б пад кіраўніцтвам ЦК на гаспадарчым фронце і па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, **падкрэсьлівалі высокае палітычнае значэньне тэй жорсткай барацьбы, якую праводзіла арганізацыя на чале са свайм ЦК супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў усіх колераў.** Выступаўшыя таварышы падкрэсьлівалі тое, што пленум ЦК пытаньне барацьбы за лінію партыі ў нацыянальна-культурным будаўніцтве паставіў на яшчэ большую прынцыповую палітычную вышыню, абвясьціўшы палуўасьць нацыянал-апартуністычных поглядаў несумяшчальнай з прыналежнасьцю да КП(б)Б. Сваёй пастановай па нацыянальным пытаньні пленум мабілізуе масы на павышэньне тэмпаў работы ў галіне практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай на пасьлядоўнае і рашучае змаганьне супроць ухілаў ад ленінізму ў нацыянальным пытаньні.

Кожная партыйная арганізацыя, згуртоўваючы шырокія масы партыйцаў вакол пастаноў пленуму, павінна дабіцца, каб кожны камуністы правільна пабальшавіцку ўразумеў палітычны зьмест пастаноў пленуму. Усякія спробы выпустошваць палітычны зьмест пастаноў, спробы дзяляцкага падыходу да іх практычнага ажыцьцяўленьня, імкненьні рэвізаваць ленінскую лінію ў нацыянальным пытаньні—павінны сустрэць самы жорсткі адпор. А што такія імкненьні і спробы з боку сяго-таго ёсьць—трэба прызнаць з усёй адкрытасьцю. **На сходзе Менскага партактыву** сёй-той прабаваў атакаваць лінію КП(б)Б у справе ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі партыі. Два таварышы прышлі да перакананьня аб неабходнасьці «тлыбей паставіць пытаньне» барацьбы з нацыянал-апартунізмам.—Мы, моў, — гавораць яны, — яшчэ і раней на папярэдніх зьездах КП(б)Б патрабавалі гэтай бязьлітаснай барацьбы, але пас ня слухалі, з намі ня лічыліся. Мы, моў, мелі рацыю, але пас ня слухалі, «не даволі прыслухоўваліся да голасу мас, да голасу, які зыходзіў ад актыву». Таварышы, падменьваючы ленінскі аналіз траскатнею «левых» фраз, імкнуцца рэвізаваць лінію КП(б)Б у нацыянальным пытаньні, **яны імкнуцца зьвесьці на нішто тую непрымірыма жорсткую разгорнутую барацьбу, якую правяла і праводзіць КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго бальшавіцкага ЦК, супроць нацыянал-апартунізму, беларускага нацыянал-дэмакратызму, супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай** небясьпекі на даным этапе, і шавінізмаў усіх колераў.

КП(б)Б разграміла прышчэпаўшчыну, якая праводзілася ў БССР па заказу контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, кіруючыя парторганы КП(б)Б зьнялі кіраўніцтва Наркамаеьветы, якое праводзіла апартуністычную лінію ў пытаньнях культурнага будаўніцтва, абнавіла кіраўніцтва Белдзяржвыдавецтва, якое замест патрэбнай марксыцка-ленінскай літаратуры завальвае кнігарні нацыянал-дэмакратычным хламам і інш. КП(б)Б на чале са сваім Цэнтральным Камітэтам **нанесла руйнуючыя ўдары па контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызьме, які падрыхтоўваў у БССР глебу для рэстаўрацыі капіталізму.**

Партыйныя масы, палітычная актыўнасьць якіх нябывала вырасла, выразна разумеюць адкуль выходзяць настрої і настроікі «левых» фразэраў, адкуль выходзяць іх спробы беспадстаўна абвінавачваць КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт у недаацэнцы нацыянал-апартунізму, недаацэнцы ажыцьцяўленьня лёзунгу самакрытыкі. Капіталістычныя элемэнты, нэпманы і кулацтва, аказваючы шалёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню, цінуць на хісткія няўстойлівыя элемэнты ў партыі. Гэтыя элемэнты, апынуўшыя ў палоне дробна-буржуазных настрояў, прабуюць «зьлева» атакаваць партыю, робяць спробы рэвізаваць не ленінскую лінію. Партыйныя масы выразна разумеюць, што не «левакі», а КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК, а бальшавіцкай пасьлядоўнасьцю, праводзіла і будзе праводзіць бязьлітаснае змаганьне з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал - дэмакратызмам, нацыянал-апартунізмам і шавінізмамі ўсіх колераў. КП(б)Б будзе весьці рашучую барацьбу за ленінскую лінію УсеКП(б) супроць правай небясьпекі, як галоўнай на даным этапе, супроць «левых» апартуністых. Ні яны—«левыя» фразэры—ні правыя апартуністыя, якія капітулююць перад труднасьцямі сацыялістычнага будаўніцтва, а партыйныя масы, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, вядучы за сабою шырокія масы пралетарыяту і асноўныя масы сялянства, адыгрываюць гістарычную ролю ў барацьбе за канчатковую перамогу сацыялізму.

КП(б)Б будзе бязьлітасна біць па ўсіх тых, хто спрабуе справа ці «зьлева» рэвізаваць ленінскую лінію партыі, хто будзе ўхіляцца ўправа ці «ўлева» ад бальшавізму.

А. К—н.

АБВЕСТКА

першай чаргі раённай Электра-станцыі

УРАЧЫСТЫ ПУСК Асінаўскай

ПРЫЗНАЧАНЫ

на 8 лістапада 1930 г. а 9 г. раніцы.

Парадак збору госьцей наступны:

1. Усе госьці зьбіраюцца ў гор. Менску 7 лістапада а 16 гадз. на вакзале, дзе іх сустракае прадстаўнік Асінбуду і а 17 гадз. накіроўваюцца ў спэцыяльна прадастаўленых вагонах да месца сьвяткаваньня (пасёлак Арэхі, Асінбуд).

2. Усе члены ўраду адпраўляюцца з г. Менску а 17 гадз. у спэцыяльна паданых вагонах.

3. Усе госьці Магілева, Воршы і Віцебску і блізкіх да іх раёнаў зьбіраюцца на станцыі Ворша, адкуль 8 лістапада а 6 гадз. будуць прадстаўніком Асінбуду разьмешчаны ў спэцыяльна паданы цягнік і адпраўлены да месца сьвяткаваньня.

Усе госьці атрымліваюць білеты ў чыг. касах без чаргі.

На ст. ст. Менск, Ворша і Хлюсьціна будуць знаходзіцца прадстаўнікі ад Асінбуду, да якіх трэба звачацца па ўсіх пытаньнях сьвяткаваньня.

УРАДАВАЯ КАМІСІЯ.

Сацыялістычныя фабрыкі

МАЛАКА І ГАРОДНІНЫ—

БАЗА РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ

ЗЬНІШЧЫМ ПЕРАШКОДЫ, ЯКІЯ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ БУДАЎНІЦТВА МАЛОЧНА-АГАРОДНЫХ ФЭРМ

42.000 ГА ПАД ПРЫГАРАДНЫЯ ГАСПАДАРКІ

Роля прыгараднай гаспадаркі ў рабочым забесьпячэньні надавычай вялікай Партыя і ўрад далі спажывецкай кааперацыі зусім выразныя дырэктывы аб значным пашырэньні прыгарадных гаспадарак і паляпшэньні іх работы.

У 1931 годзе прыгарадныя гаспадаркі БССР павінны займаць, паводле пляну, па гарадзкой сыстэме спажывецкай кааперацыі (цэрабкопах) **25 тыс. га** і на сельскай сыстэме (спажывецкіх таварыствах) — **17.250 га.**

На гэтай вялізарнай тэрыторыі кааперацыя павінна, апрача агародных гаспадарак, шырока разьвіць таксама і малочна-жывёлагадоўчыя фэрмы, сьвінагадоўчыя, трусаводныя гаспадаркі і іншыя.

Малочных фэрм павінна быць арганізавана ў будучым годзе на 12 тысяч кароў, сьвінаводных гаспадарак—на 60 тысяч галоў, трусаводных—на 10 тыс. трусоў; садова-ягадныя гаспадаркі павінны заняць 1.100 га і г. д.

Такавы пляны. Выкананьне іх значна паленшыць забесьпячэньне рабочых. Так, забесьпячэньне рабочых гароднінай зможа на 63 проц. рабіцца з уласных гаспадарак спажывецкай кааперацыі, забесьпячэньне малаком на 50 проц. Нават такімі прадуктамі, як мяса і сала, рабочыя на 38,4 проц. могуць быць забясьпечаны гаспадаркамі цэрабкопу.

НАРКАМЗЕМ І РАЙВЫКАНКОМЫ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ АДВОД ЗЯМЕЛЬ

Але, на жаль, спажывецкая кааперацыя БССР праяўляе недапушчальную пасьўнасьць у выкананьні плянаў пашырэньня прыгарадных гаспадарак, мала клапоціцца аб своячасовым адводзе зямлі пад гаспадаркі і аб падрыхтоўцы да іх арганізацыі.

У сваёй пастанове ад 14-га жніўня СНК БССР даручыў «Наркамзему і гарсаветам забясьпечыць адвод зямель для прыгарадных гаспадарак да 1-га кастрычніка бягучага году». Апрача таго, СНК БССР абавязаў Наркамзем «садзейнічаць арганізацыі прыгарадных гаспадарак, шляхам вылучэньня спэцыялістых і аказаньня дапамогі трактарамі».

Ня гледзячы на тое, што пасьля вызначанага тэрміну (1-га кастрычніка) прайшло ўжо амаль 5 тыдняў, зямля пад прыгарадныя гаспадаркі поўнасьцю ўсё яшчэ не адведзена. На гарадзкой сыстэме спажывецкай кааперацыі **замест 25 тыс. га на сёнешні дзень адведзена 19.800 га,** што складае **79 проц.**

Гомельскаму ЦРК адведзена 2.100 га замест 3.500 (60 проц.), **Віцебскаму ЦРК** — 2.700 га замест 3.500 (77 проц.), **Менскаму** — 3.140 га замест 4.000 (78,5 проц.), **Жлобінскаму ЦРК** — 800 га, замест 1.000 (30 проц.) і г. д.

Такім чынам, цэрабкопы буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР ня маюць магчымасьці поўнасьцю разгарнуць падрыхтоўку да арганізацыі прыгарадных гаспадарак, што стварае рэальную небясьпеку невыкананьня вызначаных плянаў.

Характэрна, што Жлобінскі РВК упарта ігнаруе дырэктыву СНК і катэгарычна адмаўляецца адвесьці цэрабкопу зямлю.

Па сельскай сыстэме спажывецкай кааперацыі становішча яшчэ горшае. **Замест 17.250 га адведзена ўсяго 3.900, або 23 проц.**

ЗЯБЛІВА ЗРЫВАЕЦЦА

Плян зяблёва ў прыгарадных гаспадарках цэрабкопамі правальваецца. Гэтай рабоце аддаецца мінімум увагі. У выніку з 17.500 га зямлі на сёнешні дзень узьнята пад зяб усяго каля 3.000 га, або 17 проц.

Рэкорд бязьдзейнасьці паказаў **Гомельскі ЦРК, які замест 2 тысяч га узьняў пад зяб усяго... 40 га, або 2 проц. пляну. Попацкі ЦРК узьняў пад зяб 80 га замест 500 (16 проц.), Мазырскі ЦРК —40 га замест 600 (6,6 проц.), Менскі ЦРК—950 га замест 2.500 (38 проц.).**

Каля 3-х тыдняў назад калегія Наркамзему БССР пастанавіла перакінуць часова, для правядзеньня зяблёва, у прыгарадныя гаспадаркі буйнейшых цэрабкопаў 20 трактараў. Аднак, да гэтага часу пастанова ня выканана. **Адпушчана ўсяго 7 трактараў** (Менскаму ЦРК—4 і Барысаўскаму—3). Віцебскі, Гомельскі, Магілеўскі і іншыя буйныя цэрабкопы ня маюць ніводнага трактара.

Тое самае і з выдучэньнем спэцыялістых для прыгарадных гаспадарак. Ня гледзячы на шматлікія просьбы Белкаапсаюзу, Наркамзем пакуль што ня вылучаны ні адзін спэцыяліст.

КАРОВЫ ЎСЁ ЯШЧЭ ПАД АДКРЫТЫМ НЕБАМ

Разьвіцьцю малочна-жывёлагадоўчых і сьвінаводных гаспадарак сыстэма Белкаапсаюзу аддае невыстарчальную ўвагу. Узяць хаці-б будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў у прыгарадных гаспадарках. Становішча больш чым дрэннае. У Гомелі пабудаваны 4 кароўнікі на 800 галоў. Але ў кароўніках няма яшчэ падлогі, кармушак, даху не абшыты. Фактычна розьніца невялікая паміж тым, ці знаходзяцца каровы тут, ці яны знаходзіліся-б пад адкрытым небам. Будаўніцтва-ж пятага кароўніка не разгорнута. Між тым, паводле пляну, Белкалгасбуд павінен быў скончыць пабудову пяці кароўнікаў на 1000 галоў яшчэ да 15-га жніўня. Але-ж Белкалгасбуд ня лічыць абавязковым выкананьне заказаў у тэрмін. Ён спакойна запятае будаўніцтва, прыкрываючыся «аб'ектыўнымі» прычынамі.

Па тых-жа «аб'ектыўных» прычынах у Віцебску плян будаўніцтва караўнікаў і сьвінарнікаў выкананы ўсяго на 30 проц. Замест таго, каб прыкласьці ўсе сілы для фарсаваньня будаўніцтва Белкалгасбуд адкладвае яго са дня на дзень.

Бабруйскі ЦРК таксама працуе па прыцыпіцу «пасьпеецца, не ўцячэ». Толькі 15 жніўня (амаль у канцы будаўнічага сэзону) Бабруйскі ЦРК заключыў дагавор з **Белбудаб'яднаньнем** на пабудову кароўнікаў **на 1000 галоў.** Да 1-га лістапада Белбудаб'яднаньне, паводле дагавору, павінна было здаць 2 кароўнікі, але дагавор ня выканаць. На сёнешні дзень ні зданы яшчэ ні адзін кароўнік. Тэмпы будаўніцтва марудныя. 250 кароў Бабруйскага ЦРК знаходзяцца пад адкрытым небам.

У Магілеве становішча таксама надзвычай дрэннае. **200 кароў знаходзяцца пад адкрытым небам,** а ЦРК толькі пачынае прыступіў да прыстасаваньня пад кароўнікі, старых памяшканьняў. Работа ідзе злачынна павольнымі тэмпамі.

Менскі ЦРК зьмясьціў сваіх кароў у нескончаных кароўніках. З шасьці кароўнікаў, на сёнешні дзень ні адзін поўнасьцю ня скончаны.

ЖЫВЁЛА НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНА КАРМАМІ

Прыгарадныя гаспадаркі зусім не забясьпечаны кармамі. Становішча больш чым катастрафічнае. Падамо некалькі лічбаў. На бягучы квартал кастрычнік—сьнежань прыгарадным гаспадаркам сыстэмы Белкаапсаюзу **патрэбна 5.175 тон канцэнтраваных кармоў.** Запа-жа гэтых кармоў складае **555 тон, або 10,6 проц.** Сакавітых кармоў **патрэбна 12 тыс. тон, ёсьць 4.550 тон (38 проц.).** Грубых кармоў зямест патрэбных **7.200 тон,** ёсьць **толькі 2.450 (34 проц.).** Саломы для падсьцілу патрэбна **3.000 тон, ёсьць 750 тон** (25 проц.).

«Саюзхлеб» і «Белмяса», якія павінны забясьпечваць прыгарадныя гаспадаркі кармаі, не задавальняюць заявак Белкаапсаюзу.

Цэрабкопы ў сваю чаргу не мабілізуюць унутраных рэсурсаў, ня прымаюць мер для зьмякчэньня кармавых труднасьцяй, а чакаюць разнарадак «Саюзхлеба». Плян сіласаваньня кармоў сыстэмаю Белкаапсаюзу правалены. У выніку жывёла стаіць перад пагрозаю голаду. Кармавыя запасы некаторых цэрабкопаў могуць задавольць патрэбы толькі некалькіх дзён. Патрэбны рашучыя меры.

У радзе гаспадарак панує поўная безгаспадарчасьць. Вось вытрымкі з акту абсьледваньня малочнай фэрмы Бабруйскага ЦРК: «Адсутнасьць гаспадарчага нагляду адчуваецца ўсюды... у брудных стайнях, у запушчанасьці саду, неспраўнасьці жыльлёвых памяшканьняў... У доме для сэзонных рабочых няма вокнаў, перагародкі арыўнаваны, падлогі паламаны, непрадазнены бруд».

Абсьледваньне сьвінаадкормачнага пункту Аршанскага хлебазаводу выявіла, што «сьвіньні трымаюцца ў самых дрэнных, антысапітарных умовах. Сьвінарнікі вельмі брудныя. Сьвіньні ляжаць на голай падлозе, без усякага падсьцілку. Падлога паламаная, што можа прывесьці да калецтва сьвіней. Кармленьне робіцца без усякіх норм. Паводле слоў загадчыка гаспадаркі тав. Васільевай, бруднасьць сьвінарнікаў тлумачыцца адсутнасьцю... вешкаў (!?)

Прадукцыйнасьць малочнай жывёлы значна зьнізілася. У жніўні сярэдні ўдой кароўны складаў каля 7 літраў малака ў дзень, а зараз — менш чатырох літраў. Паніжэньне ўдою ў значнай частцы тлумачыцца недахватам кармоў і пногул дрэнным доглядам жывёлы.

***

Прарывы ў арганізацыі прыгарадных гаспадарак павінны быць ліквідаваны. Вакол гэтага трэба мабілізаваць шырокую думку пралетарскай грамадзкасьці. Трэба арганізаваць сыстэматычны, шырокі рабочы кантроль над работай спажывецкай кааперацыі ў гэтай галіне. Прыгарадныя гаспадаркі павінны быць арганізаваны і працаваць поўным тэмпам. Заданьні партыі і ўраду павінны быць выкананы.

С. ГАЛКІН.

БАРАЦЬБА за ПРАЛЕТАРСКІЯ КАДРЫ

павінна быць арганічнай часткай работы партарганізацый

ДАЦЬ ЖЫЛПЛОШЧУ СОТНЯМ СТУДЭНТАЎ

ЗРЫВАЮЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ КАДРАЎ

У падрыхтоўцы кадраў для прамысловасьці і сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадарцы ёсьць рад сур'ёзных прарываў. Далёка ня ўсюды партыйныя і інш. арганізацыі аддаюць пытаньню кадраў патрабную ўвагу. Мы ўсе яшчэ сустракаемся са спасыланьнямі на «аб'ектыўныя прычыны» і назіраем нежаданьне своячасова папярэдзіць тую ці іншую пагрозу ў падрыхтоўцы кадраў. Усё гэта прыводзіць да невыкананьня адзэй з важнейшых дырэктыў нашай партыі.

Так, значная частка студэнтаў ГОРАЦКАЙ С.-Г. АКАДЭМІІ і да гэтага часу застаецца бяз жыльлёвай плошчы. Студэнты замест работы, кожны дзень трацяць па 4-5 гадзін на чаргі ў стаёўцы, у той час, як ёсьць поўная магчымасьць ліквідаваць чаргі, ужыўшы больш энэргічныя меры да перабудовы работы стаёўкі. Прынятыя ў акадэмію чырвонаармейцы, — як нам паведамляе рабкор, валяюцца ў капідорах, аудыторыях і дзе прыдзецца. У забесьпячэньні студэнтаў жыльлёвай плошчай, у акадэміі панує патрэшчынізм. Жыльлёвая плошча вельмі часта прадастаўляецца ў першую чаргу знаёмым ІГНАТАВА — камэнданта акадэміі. Сотні студэнтаў траціні месяцы, каб атрымаць стыпэндыю, у той час, як яны мелі поўнае права на яе атрыманьне.

Сьвінаводтэстам у Горках адкрыты курсы па падрыхтоўцы дырэктароў саўгасаў. Курсы працуюць некалькі месяцаў, але яшчэ не ўкамплектаваны. Замест 75 чал. займаецца толькі 50. Наведваньне курсаў вельмі дрэннае. Курсанты ня маюць магчымасьці атрымаць напэўнай кваліфікацыі з-за адсутнасьці памяшканьняў, жыльлёвай плошчы і г. д. Адзін з курсантаў у пісьце, пасланым у рэдакцыю, заяўляе, што «пры такіх умовах курсы не дадуць станоўчых вынікаў». Характэрна, што ні партыйныя, ні прафэсыянальныя арганізацыі на месцы ня цікавяцца работай курсаў, бо «курсы ўсесаюзнага значэньня». Напэўна гэтым і тлумачыцца тое, што курсанты зусім не забясьпечваюцца прадуктамі харчаваньня, прыналарамі і г. д.

Група студэнтаў чачэрскага сьвінагадоўчага тэхнікуму паведамляе, што ў Чачэрску райвыканком зрывае зімовы прыём у тэхнікум. Паводле пастановы вышэйшых органаў, райвыканком быў абавязаны падрыхтаваць для тэхнікуму адпаведныя памяшканьні, але галавацяпы з РВК лічаць, што «тэхнікум пачакае — справа не такая важная». Работнікі райвыканкому знаходзяць, што забесьпячэньне студэнтаў жыльлёвай плошчай і тэхнікуму аўдыторыямі другарадная і зусім не палітычная задача. Гэты факт гаворыць ня толькі аб палітычнай недаацэнцы падрыхтоўкі кадраў, але аб апартуністычным падыходзе да выкананьня адзэй з баявых задач — даць прамысловасьці і сацыялістычнаму сэктару сельскай гаспадаркі пралетарскія кадры.

Ня можа быць і гутаркі, што мы павінны бязьлітасна змагацца з усякімі імкненьнямі сарваць падрыхтоўку пралетарскіх кадраў. Партыя будзе бязьлітаснай да тых, хто вырашэньне баявых задач разглядае, як другарадныя, не заслугоўваючыя ўвагі справы.

ВСНГБ у Менску адкрыў курсы па падрыхтоўцы чырвоных дырэктароў. На курсы прыняты выключна рабочыя з вытворчасьці.

Мы вымушаны канстатаваць, што посьпех работы курсаў прыходзіцца ставіць пад вялікае сумненьне. Папова курсантаў на працягу больш месяцу жыве на вакзале, у аудыторыях універсытэту, а ўсе іншыя ў гасьцініцах, дзе іх кожны дзень выганяюць вон. Людзі набраны далёка не з аднолькавымі водамі. У той час, як многія з курсантаў ня маюць нават уяўленьня аб процантах, на курсах адразу прыступілі да выкладаньня эльгэбры. Усё гэта выразна гаворыць за няўважлівыя адносіны аддзелу кадраў ВСНГ да падрыхтоўкі кадраў. Падкрэсьліваем, што пры такіх абставінах нельга дасягнуць патрэбнага посьпеху ў падрыхтоўцы сапраўдных камандзіраў сацыялістычнай прамысловасьці.

Мы патрабуем, каб работа па падрыхтоўцы кадраў стала арганічнай неадлучнай часткай работы партыйных арганізацый, прафсаюзаў і савецкіх устаноў. Ня толькі на словах, але на справе трэба па-бальшавіцку змагацца за пралетарскія кадры.

Цэнтральныя ўстановы ня ўключыліся ў культэстафэту

Камсамольскі „налёт“ на цэнтральныя ўстановы

Пры Наркамасьветы адбылася нарада камсамольцаў-«легкіх кавалерыстых», якія былі мабілізаваны ЦК ЛКСМБ для «налёту» па заданьнях усебеларускага штабу культэстафэты на ўсе цэнтральныя ўстановы і арганізацыі для выяўленьня наколькі яны ўключыліся ў культэстафэту.

«Налёт» выявіў, што ў радзе ўстаноў і арганізацый нічога ня зроблена па выкананьні маршрутаў культэстафэты. У большасьці з іх яшчэ ня выбраны тройкі па правядзеньні культэстафэты. Некаторыя ўстановы і арганізацыі абмежаваліся арганізацыйнай работай (склалі пляны, паслалі інструкцыі), а канкрэтна і практычна, нічога не зрабілі.

Наркамгандлю, Белдзяржкіно, Менбуд, Белжылсаюз, Белкаапсаюз, Наркамаем, БДВ, БАН, Менская пошта і нават саюз «Праф інпісьменнасьць» не разгарнулі работы па правядзеньні культэстафэты.

У Белжылсаюзе «налётчыку» растлумачылі, што ўліку нэпісьменных яны не правялі таму, што бачыце, у іх усе пісьменныя...

Паводле думкі адміністрацыі Менбуду, культэстафэта не датычыць адміністрацыі, а выключна рабачкому. У Наркамгандлю ліст штабу культэстафэты атрымалі і спакойна, зусім ня чытаючы яго, палажылі ў стол. У выніку ніхто ў Наркамгандлю аб эстафэце нічога ня ведаў.

Архібюракратычны адказ атрымалі «налётчыкі» ў саюзе «Праф інпісьменнасьць», дзе зусім нічога яшчэ не праведзена. Калі ўдзельнікі «налёту» зьвярнуліся да культработніка т. **Сьцепанюка,** дык яны атрымалі такі адказ: «Так і скажэце, што Сьцепанюк нічога не зрабіў і

Да Кастрычніцкіх сьвят— скончыць здачу збожжа—

БАЯВОЕ ЗАДАНЬНЕ КАЛГАСАМ

ПЛЯН ЗА КАСТРЫЧНІК НЯ ВЫКАНАН

Ёсьць некаторы зрух, але невыстарчальны

Зводка ходу загатовак збожжа па БССР за апошнюю пяцідзёўку кастрычніка — на 1 лістапада 1930 году сьведчыць аб НЕКАТОРЫМ, падкрэсьліваем, толькі некаторым, перапоме ў ходзе збожжазагатоўчай кампаніі.

Калі за 5-тую пяцідзёўку кастрычніка было загатоўлена 10,9 проц. месячнага пляну, дык за 6 пяцідзёўку сабрана 13,6 проц.

Усяго з пачатку месяца загатоўлена 76,3 пляну. Такім чынам, ПЛЯН ЗА КАСТРЫЧНІК НЯ ВЫКАНАН.

З пачатку году, паводле даных Саюзхлеба, загатоўлена толькі 50,9 проц. гадавога заданьня.

Характарызуючы ход загатовак за мінулыя пяцідзёўкі, мы адзначалі вельмі слабую здачу збожжа саўгасамі і калгасамі. Зараз ёсьць некаторы зрух у здачы імі лішкаў, але ГЭТЫ ЗРУХ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ.

САЎГАСЫ, якія за 5 пяцідзёўку здалі 4,6 проц. месячнага пляну, павялічылі здачу за апошнюю пяцідзёўку кастрычніка на 1,2 проц. — да 5,8 проц.

Месячны плян выканан імі на 21,6 проц. Гэта лічба сьведчыць аб слабой увазе раённых загатоўчых арганізацый да здачы збожжа саўгасамі, аб існаваньні яшчэ старых настрояў: «саўгаснае збожжа ад нас не ўцячэ». З пачатку году саўгасы БССР загатовілі толькі 19,3 проц. гадавога пляну.

КАЛГАСЫ павялічылі здачу збожжа з 3,7 проц. да 5,5 проц. Месячны плян выканан імі толькі на 26,1 проц., а гадавы — на 37,3 проц. Гэтыя вынікі сьведчаць аб тым, што Белкалгасцэнтр, райкалгассаюзы не прынялі патрэбных мер да здачы калгасамі лішкаў збожжа. Мала што зроблена, каб арганізаваць сустрэчны плян калгасаў, каб узьняць магутную хвалю чырвоных абозаў імя Кастрычніцкае рэвалюцыі.

Індывідуальны сэктар выканаў плян загатовак за апошнюю пяцідзёўку кастрычніка на 22,8 проц. Месячны плян ім выканан на 126 проц., а гадавы —на 61,8 проц.

Па кантрактацыі здана за апошнюю пяцідзёўку толькі 5 проц. месячнага пляну, за ўвесь-жа кастрычнік—толькі 42,4 проц. Гадавы плян выканан на 33,9 проц.

Белкалгасцэнтр даў калгасам катэгарычнае заданьне — скончыць плян загатовак да 10 гадавіны Кастрычніцкае рэвалюцыі. Гэта заданьне патрабуе баявых тэмпаў работы, мабілізацыі ўсёй энэргіі райкалгассаюзаў, праўленьняў калгасаў, перадавых калгасьнікаў на выкананьне пляну.

Калгасы павінны паказаць прыклад датэрміновай здачы лішкаў збожжа дзяржаве. І, нарэшце, зусім нельга дапусьціць АДСТАВАНЬНЯ САЎГАСАЎ. Тут трэба ўжыць самыя суровыя меры ў адносінах да кіраўнікоў саўгасаў, якія затрымліваюць збожжавыя лішкі і тым перашкаджаюць выканаць плян загатовак.

Калгасы—у першыя рады здатчыкаў

Пастанова Белкалгасцэнтру

Праўленьне Белкалгасцэнтру ў спэцыяльнай пастанове аб ходзе збожжазагатовак па калгасах адзначыла, што праверкай па некалькіх раёнах выяўлена адсутнасьць выразнага ўліку збожжа, якое паступае ад калгасьнікаў; спажывецкія таварыствы заліч ваюць калгасны хлеб у агульныя загатоўкі індывідуальнага сэктару, што не дае сапраўднага малюнку выкананьня калгасамі і калгасьнікамі сваіх абавязкаў перад дзяржавай.

Праўленьне Белкалгасцэнтру пастанавіла: за неправядзеньне адпаведнай растлумачальнай работы і нярпыняцьце патрэбных арганізацыйных мер да сваячасовага выкананьня калгасамі і калгасьнікамі пляну збожжазагатовак, шляхам мабілізацыі ўсіх сіл — абвясьціць вымову праўленьням Расонскага, Чэрвеньскага і Барысаўскага райкалгассаюзаў.

Праўленьні калгасаў і райкалгассаюзаў павінны безадкладна ўзмацніць тэмпы здачы збожжа па кантрактацыі, асабліва таварных лішкаў з такім разьлікам, каб плян збожжазагатовак калгасамі быў абавязкова выкананы да 13-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Праўленьні калгасаў і перадавыя калгасьнікі павінны рашуча змагацца са шкоднымі настроямі — не сьпяшацца са здачай калгаснага збожжа.

Праўленьнем калгасаў і райкалгассаюзам прапанавана мабілізаваць усіх калгасьнікаў вакол пытаньняў поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак, рашучага адпору кулацкім элемэнтам. Райкалгассаюзы павінны праверыць, як здаюць збожжа калгасы і калгасьнікі.

У праверку трэба ўцягнуць усіх калгасьнікаў, рабочыя брыгады і інш.

Груба парушаюць дырэктывы партыі

БАГУШЭЎСКАЕ. (Наш кар.). Багушэўскі раён у галіне выкананьня збожжазагатовак пляцецца ў хвосьце. Многія кулацкія гаспадарні не атрымалі цьвёрдых заданьняў. У 5 сельсаветах плян не даведзены поўнасьцю да вёскі. Райвыканком ня ведае, як выкананы планы загатовак паасобнымі вёскамі.

Астапенскі сельсавет, каб ліквідаваць прарывы ў здачы збожжа і самазастрахаваца ад абвінавачваньня ў правапартыйнай бязьдзейнасьці, замест цырокай масавай работы, замест цьвёрдага націску на кулацкія гаспадаркі, пачаў даводзіць цьвёрдыя заданьні да маломоцных бядняцка-серадняцкіх дваёў, якія плацяць па 7-8 руб. падатку, груба парушаючы гэтым дырэктывы партыі і ўраду.

Багушэўскі РВК пастанавіў распусьціць і аддаць пад суд за злачынную бязьдзейнасьць, правапартыйныя адносіны да кулацка-заможных гаспадарак прэзыдыум Новасельскага сельсавету.

Прэзыдыум прыняў меры да ліквідацыі «левых» загібаў астапенскіх сельсаветчыкаў.

П. Г.

Астрашыцка-Гарадзецкі раён—на чырвоную дошку

ГЭТЫМІ ДНЯМІ НАРКАМГАНДЛЮ БССР АТРЫМАНА НАСТУПНАЯ ТЭЛЕГРАМА З АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКАГА РАЁНУ:

— АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКІМ РАЁНАМ ГАДАВЫ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК У 1.008 ТОН — ВЫКАНАНЫ. ЗДАДЗЕНА 1.086 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 107,7 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

РАЁН ЗАРАЗ ПРАВОДЗІЦЬ РАБОТУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ДАДАТКОВАГА СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ ДА 7-ГА ЛІСТАПАДА.

Агентаў кулацтва зьняць з работы

Пядаўна ў «Зьвязьдзе» быў надрукаваны сьпіс раёнаў, якія ня выканалі пляны збожжазагатовак, якія плятуцца ў хвасьце.

Лісты рабселькораў з месц высьвятляюць прычыны прарываў на збожжазагатоўчым фронце, даюць рад прыкладаў злачынна нядбайных, апартуністычных адносін раду арганізацый да загатоўчай кампаніі.

Тав. Брушкоў у сваёй карэспандэнцыі з Аршанскага раёну піша, што Аршанскі райкаасгасаюз нічога ня робіць у справе загатовак. Плян загатовак бульбы па індывідуальным сэктары выкананы на 23 проц., а калгасамі—на 9 проц. Загатоўкі збожжа ідуць самацёкам. Калгасы Сталінскага сельсавету ня здалі піводнага кілё, між тым, калгасы Крапівенскага, Баранскага, Машкоўскага сельсаветаў здалі ўсе свае лішкі і перавыканалі гадавы плян.

Палова сельсаветаў яшчэ ня прыступіла да здачы яравога збожжа. Няма ніякай праверкі выкананьня дагавораў па кантрактацыі.

Цьвёрдыя заданьні да кулака-заможных гаспадарак не даведзены, ды і саміх кулацкіх гаспадарак па раёне выяўлена толькі тры. Райвыканком нічога ня робіць, каб узмацніць загатоўкі, піводны злосны нядзатчык збожжа ня прыцягнуты да адказнасьці.

Тав. Брушкоў зусім правільна характарызуе адносіны паказаных вышэй арганізацый да загатовак, як правапартыйныя.

«Чакаюць самацёку»—так характарызуе работу чэрыкаўскіх каапэратараў у галіне збожжазагатовак работнік раёну, т. П—ы. Чэрыкаўская спажывецкая каапэрацыя выканала толькі 28,7 проц. гадавога пляну. Праўленьне спажывецкага таварыства скрозь пальцы глядзіць на пагрозу загатоўкам. Члены праўленьня сядзяць у мястачку і ня выяжджаюць у раёны. Работнікам Іванову і Ананічу было прапанавана выехаць на загатоўкі, яны адмовіліся, праўленьне ня ўжыло ніякіх мер да сабатажнікаў. На пытаньне, што робіць праўленьне, для таго, каб дабіцца пералому ў загатоўках, члены праўленьня адказваюць: «прывязуць збожжа на пункты, прымем; пісьмовыя паказаньні даны, куды здаваць — паведамлена, больш—ня наша справа; няхай агітуюць сельсаветы». Брыгадзір па загатоўках сена тав. Невяровіч у сваім лісьце спыняецца на ходзе загатовак збожжа і сена па Шклоўскім раёне. У в. Сьмятанічах яшчэ не абрана камісія садзейнасьці загатоўкам. У Вяліка-Лозіцкім сельсавеце члены камісіі садзейнасьці і сельсавету не адважваліся даводзіць плян да вёскі, матывуючы гэта тым, што «некаторыя сяляне будуць пакрыўджаны і нездаволены». Зразумела, хто будзе нездаволены. Кулак, які імкнецца ўсімі сіламі сарваць пляны загатовак.

Рабселькоры аднадушна прапануюць, каб былі ўжыты самыя рэпрэсіўныя меры ў адносінах да кулацкага сабатажу, каб агенты кулацтва ў пізавых органах былі-б зьняты з работы і прыцягнуты да адказнасьці.

Аб тым, наколькі дрэнна разгортваецца зьбіўка на раёнах ярка сьведчаць наступныя лічбы. Паводле даных па 25 кастрычніка, Халопеніцкі раён выканаў 6,7 проц. заданьня на зьбіўке Чачэрскі—6,5 проц., Чырвонапольскі№ 9, проц., Лёзьнянскі—6,6 проц., Расонскі — 2,9 проц., Вушацкі — 6,1 проц. і г. д.

Дабіліся зруху ў ходзе зьбіўка наступныя раёны: Вяломльскі (65.7 проц. пляну), Койданаўскі (55,8 проц.), Самахвалавіцкі (60,9 проц.), Капыльскі (83 проц.), Уваравіцкі (72,2 проц.), Чырвонаслабодзкі (71,1 проц.), Любаньскі (70 проц.), Бабруйскі (70,8 проц.) і Сьмілавіцкі (83,5 проц.)

Напярэдадні Кастрычніцкіх сьвят

У дні сьвяткаваньня XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі на прадпрыемствах гарбарнай прамысловасьці БССР арганізуюцца ўдарныя брыгады імя XIII гадавіны Кастрычніка. Лепшыя ўдарнікі будуць прэміяваны. На вытворчыя вечары запрошаны падшэфныя калгасьнікі. Рабочыя брыгады выяжджаюць у падшэфны раён.

Абуткоўная фабрыка пераводзіцца на 7-гадзінны рабочы дзень.

Па саюзе гарнарабочых будуць адкрыты два клюбы пры торфазаводах імя 1 МАЯ (Чашнікі) і «БАЛЬШАВІК» (Гомель). На Добрускім заводзе «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ» адкрываецца школа ФЗВ на 80 чалавек.

На станцыі ОБЕЛЬ, ВУЛЬСКАГА РАЁНУ, адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё заводу ізаляцыйных пліт імя ДАЎМАНА. На гэтым заводзе будзе працаваць 700 рабочых. Для абслугоўваньня сэзонынкаў-тарфянікаў адкрываецца 10 хат-чытальнь, арганізуецца 10 біліятэк. Рабочыя брыгады торфазаводаў выяжджаюць у вёску да сваіх падшэфных сэзонынкаў-тарфянікаў.

У ГОМЕЛЬСКІМ раёне адбудзецца ўрачыстая закладка галоўнага корпусу новай мэханізаванай гуты і адкрыцьцё 2-х дамоў для рабочых.

Цэнтральны савет т-ва «Прыхільнікаў радыё» зьвярнуўся з адозвай да ўсіх членаў і ячэек ТПР аб арганізацыі сацспаборніцтва паміж ячэйкамі да сьвята XIII гадавіны Кастрычніка.

Прапанавана ўсім членам і ячэйкам ТПР уключыцца ў сацспаборніцтва на правядзеньні радыёфікацыі і радыё-абслугоўваньня сваіх прадпрыемстваў. На тых прадпрыемствах, дзе няма ячэек ТПР, прапанавана радыё аматарам узяць ініцыятыву па арганізацыі ячэек. Лепшыя ячэйкі ТПР будуць прэміяваны.

У дні Кастрычніцкіх сьвят пачынае свае першыя выступленьні Беларускі вакальны квартэт у складзе т. т. Валодзька, Пуроўскага (тэнары) і двух Нікалаевічаў (басы).

8 лістапада ў Бабруйску адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё каніфольнага заводу, хлебазаводу і тэлефоннай паўаўтаматычнай станцыі.

Лепшых ударнікаў

НА АДКРЫЦЬЦЁ АСІНБУДУ ЗАГАД № 705

па Вышэйшым Савеце Народнае Гаспадаркі БССР

Гераічнымі намаганьнямі рабочае клясы БССР, пры дапамозе ўраду СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, атрымана яшчэ адна перамога на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

На Асінаўскіх тарфяных балотах скончана пабудова першае чаргі Бел. ДРЭС імя Сталіна.

Урачыстае адкрыцьцё гэтай станцыі прысьвечана да Кастрычніцкага сьвята — 8 лістапада.

Білеты, разасланыя ўрадавай камісіяй на адкрыцьцё першай чаргі Сталінбуду па прадпрыемствах, павінны быць разданы лепшым ударнікам. Для гэтага прапануецца кіраўнікам аб'яднаньняў і прадпрыемстваў забясьпечыць выяжджаючых тавыршоў сродкамі на білеты з фонду сацспаборніцтва.

Старшыня ВСНГ БССР
ГРЫСЕВІЧ.

Замежныя рэвалюцыянэры ў Мэнску

Для ўдзелу ў сьвяткаваньні 13-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, сёньня прыяжджаюць у Менск вядомыя замежныя рэвалюцыянэры тав. Бэльке (Нямеччына) і тав. Залітаў (Латвія).

Сёньня гэтыя замежныя рэвалюцыянэры выступяць на Інтэрнацыянальным мопраўскім вечары ў клюбе Працасьветы.

8 лістапада—

Усебеларускі ўдарны суботнік

Забясьпечым удзел у суботніку ўсіх працоўных

Двухтыднёвік паходу за мэталь

З пастановы Белкамітэту саюзу мэталістых

Бурны рост індустрыялізацыі Савецкага Саюзу, усё ўзрастаючыя тэмпы пабудовы новых і рэканструкцыя старых мэталя-электра-прадпрыемстваў, якія штогод абганяюць першапачатковыя намёткі паводле пяцігадовага пляну, патрабуюць адпаведнага забясьпячэньня прамысловасьці сырцом.

Задача максымальнага разьвіцьця мэталюргічнае базы і перажываньня таму труднасьці ў адносінах забясьпячэньня сырцом мэталяпрамысловасьці БССР патрабуюць максымальнай рацыяналізацыі ў разьмеркаваньні мэталю, строгай эканоміі, мабілізацыі ўнутры-прамысловых рэсурсаў. Адным з мерапрыемстваў павялічэньня мэталёвага сырцу павінен зьявіцца збор мэталя-лому і строгі вучот наяўных запасаў.

Прэзыдыум Белкамітэту заклікае мэталістых БССР падхапіць прапанову рабочага украінскага заводу т. Шулікоўскага аб арганізацыі 8 лістапада суботніку збору мэталя-лому, які павінен палажыць пачатак правядзеньню двухтыднёвіка «Паход за мэталь».

Прэзыдыум Белкамітэту саюзу мэталістых пастанаўляе:

1. Абвясьціць двухтыднёвік «паходу за мэталь» у пэрыяд з 8 да 25 лістапада, на ўсіх мэталя-электра-прадпрыемствах Беларусі.

2. Для кіраўніцтва «паходам за мэталь» вылучыць Усебеларускі штаб у складзе: ад Белкамітэту саюзу мэталістых т. Місюра (старшыня штабу), ад БМА т. Любамірскага, ад Рудмэталягандлю—т. Багушэўскага.

Кіруючаму штабу на працягу 3-х дзён выпрацаваць плян дзейнасьці па гор. Менску, увязаўшы работу са штабам ЦПСВ і штабам саюзу чыгуначнікаў.

Прэзыдыум прапануе ўсім ФЗМК справу мэталя-лому шырока папуляризаваць сярод шырокіх мас, паставіўшы гэта пытаньне на абгаварэньне рабочых сходаў. Для кіраўніцтва работай на прадпрыемствах стварыць заводзкія штабы кіраўніцтва «паходам за мэталь», з такім разьлікам, каб у штаб увайшлі лепшыя ударнікі, прадстаўнікі ад заводакіраўніцтва, члены заўкому, ІТР і прадстаўнікі ад мясцовых органаў Рудмэталягандлю.

Заводзкім штабам у сваёй практычнай рабоце праверыць наяўнасьць запасаў усіх мэталяў у складах прадпрыемстваў і асобнай заводкай паведамляць Белкамітэт.

Ход кампаніі шырока асьвятляць у заводзкіх газэтах, а таксама ў мясцовым і рэспубліканскім друку, мабілізаваўшы для гэтага ўсю рабкораўскую масу.

Прэзыдыум Белкамітэту зварачаецца да ўсіх членаў саюзу мэталістых прыняць актыўны ўдзел у гэтай кампаніі, шляхам унясьненьня сваіх прапаноў па рацыяналізатарскіх мерапрыемствах на лепшую эканомію мэталю, рацыянальным скарыстаньні адходаў вытворчасьці, якія могуць быць скарыстаны як паўфабрыкаты для іншых вытворчых прадпрыемстваў, ці на іншых заводах, выяўляючы ўсе недахопы, адмоўныя моманты, якія затрымліваюць рэалізацыю мэталя-лому і перашкаджаюць рацыянальнаму скарыстаньню яго.

План правядзеньня суботніку па г. Менску 8-га лістапада

1. На ўсіх фабрыках, заводах і іншых гаспадарчых установах рабочыя працуюць на сваіх прадпрыемствах. На тых прадпрыемствах, дзе ёсьць некалькі зьмен, працуе на сталай рабоце адна зьмена. Астатнія рабочыя працуюць разам з работнікамі абслугоўваючага апарату прадпрыемстваў і студэнтамі тых факультэтаў, якія прымаранаваны да той ці іншай фабрыкі і заводу, па дапаможных работах у прадпрыемстве (мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў, збор мэталя-лому, ачыстка заводзкіх двароў і г. д.).

2. Саюзы саўгаднасьлужачых, камунальнікаў, нархарч (хатнія работніцы) вылучаюць, паводле загаду камісіі, адпаведную колькасьць брыгад для работы на чыгунцы, торфа-распрацоўках, сельскіх гаспадарках і складах МІРК, складах Саюзхлебу, на транспарце і інш. аб'ектах работы, скарыстоўваючы астатніх членаў саюзаў па сваіх установах і прадпрыемствах для ўсякіх гаспадарчых работ, збору мэталя-лому, уцільсырцу, макулатуры, дапушчаючы застаўленьне некаторых супрацоўнікаў гэтых устаноў на усякія апэратыўныя работы на займанай пасадзе.

3. Саюз швэйнікаў вылучае, паводле загаду камісіі, брыгады для пачынкі і пашыўкі мяшкоў у Саюзхлебе і МІРК.

4. Саюз медсанпрацы арганізуе брыгады па агляндзе санітарнага становішча прадпрыемстваў, школ, складаў, пакгаузаў, вакзалаў, сталовых, крам скарыстоўваючы астатніх членаў саюзу на месцы іх работы на ўсякіх гаспадарчых работах (збор мэталя-лому, уцільсырцу, макулатуры, пашыўка і пачынка бялізны і г. д.).

5. Саюз працасьветы скарыстоўвае членаў саюзу на гаспадарчых работах у навучальных установах, вылучае па школах адпаведную колькасьць вучняў у загад Фрунзаўскага і Кастрычніцкага РК ЛКСМБ для правядзеньня збору па горадзе мэталя-лому, уцільсырцу і макулатуры.

6. Гарадзкое аддзяленьне Белсампрамсаюзу праводзіць суботнік у сваіх арцелях, скарыстоўваючы рабочых на сталай рабоце і абслугоўваючы апарат на ўсякіх дапаможных работах.

7. Усе жакты гораду праводзяць суботнік па жактах, на зборы мэталя-лому, уцільсырцу, макулатуры, ачыстцы двароў, садоў і г. д.

8. Кіраўніцтва ўсёй работай суботнікаў на прадпрыемствах і установах ускладаецца на трыкутнік, які павінен да 6-га лістапада распрацаваць канкрэтны плян аб'ектаў работ у сябе.

9. Усе сродкі, атрыманыя ад правядзеньня суботніку павінны гаспадарчымі органамі быць пераведзены на працягу ня больш пяці дзён на бягучы рахунак у фонд агульнага навучаньня і палітэхнізацыі школ Дзяржбанку.

10 Суботнік праводзіцца на працягу ня больш 4-х гадзін з 9-ці гадзін раніцы.

Беларускі тыдзень у Маскве

ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ УСЕСАЮЗНАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ АКАДЭМІІ Ў ПАЛОВЕ СЬНЕЖНЯ ГЭТАГА ГОДУ АРГАНІЗУЕЦЦА БЕЛАРУСКІ ТЫДЗЕНЬ У МАСКВЕ З МЭТАЙ АЗНАЁМЛЕНЬНЯ ШЫРОКАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГРАМАДЗКАСЬЦІ САВЕЦКАГА САЮЗУ З ДАСЯГНЕНЬНЯМІ ГАСПАДАРЧАГА І КУЛЬТУРНАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР.

ПАД СТАРШЫНСТВАМ РЭКТАРА КАМ. АКАДЭМІІ ТАВ. КЕРЖАНЦАВА СТВОРАН ШЫРОКІ ГРАМАДЗКІ КАМІТЭТ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ГЭТАГА ТЫДНЯ.

У ГЭТЫ КАМІТЭТ УВАХОДЗЯЦЬ ПРАДСТАЎНІКІ РОЗНЫХ ГАСПАДАРЧЫХ І КУЛЬТУРНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. ПРАДСТАЎНІКІ ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ, ПАРТЫЙНЫХ, ПІСЬМЕНЬНІЦКІХ І МАСТАЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

КАМІТЭТ ЗАПРАШАЕ ПРЫЕХАЦЬ У МАСКВУ ДЛЯ АЗНАЁМЛЕНЬНЯ З ДАСЯГНЕНЬНЯМІ ГАСПАДАРЧАГА І КУЛЬТУРНАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА БССР ПРАДСТАЎНІКОЎ ГАСПАДАРЧЫХ І КУЛЬТУРНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР, РАБОЧЫХ — 15 ЧАЛ., КАЛГАСЬНІКАЎ — 10 ЧАЛ. НАСТАЎНІКАЎ, ПІСЬМЕНЬНІКАЎ, НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ, МАСТАКОЎ, БТД-1, ПОЛЬСКІ І ЯЎРЭЙСКІ ВАНДРОЎНЫЯ ТЭАТРЫ, БЕЛАРУСКУЮ КАПЭЛЮ, ДВА КЛЮБНЫЯ ГУРТКІ САМАДЗЕЙНАСЬЦІ, АНСАМБЛЬ НАРОДНЫХ ІНСТРУМАНТАЎ. УСЯГО ПАЕДЗЕ Ў МАСКВУ КАЛЯ 250 ЧАЛ.

АРГАНІЗУЮЦЦА 4 ВЫСТАЎКІ: ГАСПАДАРЧЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ, КНІЖНАЯ, ШКОЛЬНАЯ І ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА.

НАМЕЧАНА ВЫДАЦЬ 4 КНІЖКІ: АБ ГАСПАДАРЧЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, КУЛЬТУРНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, АБ ЛІТАРАТУРЫ, А ТАКСАМА ЛІТАРАТУРНЫ АЛЬМАНАХ.

Ліст у рэдакцыю

Таварыш рэдактар!

Прашу не адмовіць надрукаваць у вашай газэце наступнае:

У чацьвертым томе «Літаратурнай Энцыклопедыі», які толькі што выйшаў з друку, у нататцы пра мяне таварыш па: «В 1929 г. вышла первая книга стихов З. «Буры ў граніце», где он объективно воспроизвел настроение деклассирующейся части белорусского мещанства» (падкрэслена мною—А. З.). Такім парадкам, мне «аб'ектыўна» прыпісваецца годнасьць ідэолёга беларускага мяшчанства.

Выношу свой пратест супроць такога безадказнага і ні на чым не абгрунтаванага выпаду супроць мяне з боку тых, хто складаў і рэдагаваў адзінае беларускай літаратуры «Літаратурнай Энцыклопедыі».

А. ЗВОНАК.

28/X—30 г.

АД САКРАТАРЫЯТУ БелАПП'У

Сакратарыят БелАПП'у лічыць адпаведным апублікаваць ліст А. Звонака, дадаючы ў «Літаратурнай Энцыклопедыі» пра творчасьць А. Звонака, які ня ведае, ня ведаючы і нярэдка, Памылкі ў памянёным зборніку («Буры ў граніце»), а таксама пазьнейшая творчасьць А. Звонака не даюць падставы для прыстасаваньня такое ацэнкі.

Паведамленьні

— **Партрэйка Кастрычніцкай РКП** (вул. К. Маркса, 3) выклікае на 6 з пал. гадз. увеч. наступных т.т.: Раўбуш А. Л., Юрыс К. І. з зав. «Энэргія», Арановіч з аямц. ф-кі, Марголіна Я., Бялыняцоў з абутк. ф-кі, Бандарова М. Н. — спіртазавод, Шэвяха — ВСНГ, Магамэта — мэдфак, Арэйсова — вайск. арг., Іванова з Білебску, Вяжэвіча — абутк. майст., Зотава А. К., Кошчэва — чыгунка, для ўдзелу пры разглядзе іх справу. Таксама выклікаюцца сакратары парэйчэк, дзе гэтыя т.т. лічацца на вуліце.

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** выклікае на 6 гадз. увеч. у райком наступных т.т.: Хурсік — БДУ, Шэйфрын — НКЮ, Лойка — «Пралетарый», Шульман — хэмінстытут, Літвінова — мэдфак, Марясіна — НКЮ, Лабадаеў — ЦК КП(б)Б, Казлоў — НКЮ, Катапоцак — мэдфак, Шулец — мэдінстытут, Шаліма — будінстытут, Васілеўскі — мэдфак, Варонцанка — хэмінстытут, Крывапосаў — хэмінстытут, Дрэздоўская — ПВК, Жука абавязкова.

— **Культпроп Кастрычніцкага РК КП(б)Б** склікае нараду трыкутнікаў навучальных устаноў а 6 гадз. увеч. у памяшканьні РК па пытаньні аб скліканьні вузаўскай канфэрэнцыі ударнікаў. Жука сакратарэй ячэек, старшынь прафкомаў і кіраўнікоў навучальных устаноў абавязкова. Выклікаюцца наступныя навучальныя установы: хэм. тэхн. інстытут, буд. інстытут, мэдфак, рабфак, мэдінстытут, сакбуд, нарпас, курсы дырэктароў, хэм. тэхнікум, школа мэдсясьпэр.

СЕНЬНЯ:

— **Дом Пісьменьніка.** А 7 гадз. увеч. — сход менскай філіі БелАПП'у разам з мастакамі «РОМБ» і расійскімі пісьменьнікамі. У парадку дня: 1) Сустрэча з брыгадай расійскіх пісьменьнікаў; 2) Аб супольнай працы пісьменьнікаў і мастакоў на прадпрыемствах.

— **БАН.** А 12 гадз. раніцы у памяшк. Інту гістарычных навук БАН (3-ці паверх, пак. № 19) — агульны сход супрацоўнікаў Інстытуту. Парадак дня: 1) Пераглядзіць плянаў прац інстытуту гісторыі на бягучы квартал і 1931 г.; 2) Аб арганізацыі крытычнага агляду друкаваных гістарычных прац ІЕК і БАН. Запрашаюцца ўсе навуковыя супрацоўнікі і асьпіранты. Уваход вольны.

— **Дом Асьветы.** А 7 гадз. увеч. — экстраны сход дашкольнай пэд. ячэйкі ЛКСМБ працасьветы. Жука камсамольцаў абавязкова.

— **Рэсп. бюро АРУ.** А 7 гадз. увеч. у памяшк. АРУ (Савецкая, 55, б. Арбуд) — чарговае пасяджэньне прэзыдыуму рэсп. бюро АРУ. Запрашаецца актыў АРУ.

ЗАЎТРА:

— **Дом Асьветы.** Урачысты вечар, прысьвечаны сьвяткаваньню XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уваход па разданых білетах. Пачатак вечара роўна ў 7 з пал. гадзін.

— **Дэканат факультэту сакбудаўніцтва і права** паведамляе, што 6 лістапада заняткаў па вячэрн. форме сак. буд. і права ня будзе.

— **Дом Санітарнае Асьветы** 8 лістапада будзе адчынены з 12 да 3 з пал. гадзіны.

— **ПК ЦКК КП(б)Б** просіць РК і ячэйкі КП(б)Б паведаміць аб месцы прабываньня і апошняй работе члена КП(б)Б г. **Краўцова, Васіля Мікалаева.**

— **Аддзел разьмеркаваньня ЦК КП(б)Б** просіць зьявіцца ў ЦК, пакой № 1, тав. Лагаву (скончы БДУ) па яе справе.

— **Кастрычніцкі РК КП(б)Б** прапануе ўсім членам партыі, якія скончылі ў розныя тэрміны курсы марксізму, а таксама ўсім прабываючым на гэтых курсах ня менш аднаго году, зьявіцца ў Кастрычніцкі РК КП(б)Б для запаўненьня неабходных вестак.

— **Камвуз Беларусі імя Леніна** паведамляе, што заняткі на ўсіх аддзяленьнях і курсах, уключаючы курсы актыву ЛКСМ (апрача нарасьветы) пачнуцца 1-га сьнежня.

— **Фрунзаўскі райком КП(б)Б.** 16-га лістапада ў 6 гадз. увеч., у залі Дому Камасьветы скліцаецца **1-я канфэрэнцыя валуйчых бязбожнікаў Фрунзаўскага раёну.** Выбраныя ад ячэек СВБ делегаты на модусу 1 ад 5-ці ваўнікі атрымаць мандаты з 10 па 15 лістапада включна ў Цэнтральным Савеце Бязбожных Бязбожнікаў БССР (пляц Волі, НКА, 3-ці паверх, пакой № 18). Парадак дня: 1) Рэлігія і сац. будаўніцтва (дакл. праф. Вазьерсон); 2) Чарговыя задачы антырэлігійнай прапаганды (т. Дайтапоў); 3) Выбары райсавету і рэвіз. камісіі; 4) Бягучыя справы. Пасьля канфэрэнцыі — мастацкая частка.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
СЭЗОН 1930/31 (пяты) у г. МЕНСКУ.

СЕРАДА, 5 лістапада
„ГОРАД ВЯТРОЎ"
Сацыяльная трагедыя ў 5 дзеях 10 абразох.
Пастаноўка С. РОЗАНАВА і М. МІЦКЕВІЧА.
Мастак Ю. ГОЛЫД.
Музыка СТАРАКАДОМСКАГА.
Дырыжэр І. ГІТГАРЦ.
—. Пачатак а 8 з пал. гадз. (—

Кіно-тэатр „Культура"
Гістарычны фільм
1917 год.
Звыш праграмы:
За 12.000
Пачатак сэансу а 1 г., увеч. а 7 г.
Другі тыдзень сучасны бытавы фільм
ОРДЭР НА ЖЫЦЬЦЁ
Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. увеч.
Каса адкрыта ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Інтэрнацыянал"
Сумесная пастаноўка „Саюзкіно" і „Взльтфільм"
СЁНЬНЯ
Пачатак а 6 гадз.
Каса з 5 гадз.

КІНО „Пралетары"
4-я заключная серыя
Стэнлей у нетрах Афрыкі
Пачатак а 12 г. 30 м.
Каса з 11 г. дня.

Кіно „Юны піянэр"
Выдатны бытавы фільм
СОРАК [41] ПЕРШЫ
Трагедыя ў 6 частках.
ПАЧАТАК: 7 г., 9 г., 10 г. 45 м.
КАСА—з 5 г. 30 м.

КІНО „СПАРТАК"

НКАЗ БССР арганізуе
6-месячныя курсы па падрыхтоўцы
сясьцёр Ахматмладу
для дагляду дзяцей ад 0 да 4 год.
На курсы прымаюцца асобы ад 18 год, якія маюць адукацыю ня менш 4 груп сямігодкі.
Пры прыёме перавага даецца работніцам, калгасьніцам і дзецям рабочых.
Пры падачы заявы неабходны рэкамэндацыі прафсыяных, савецкіх і іншых грамадзкіх арганізацый.
Курсанткі будуць забясьпечаны стыпэндыяй у 30 руб. у месяц. Інтэрнат (як месцовым, таксама і прыезджым) прадастаўляцца ня будзе.
Заявы прымаюцца ў НКАЗ БССР да 16-га лістапада г. г.
Пачатак заняткаў на курсах 25 лістапада г. г.
Курсы рыхтуюць працаўнікоў для раённых устаноў Ахматмладу.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
паведамляе, што яно
забясьпечвае ўсімі чарцёжнымі прыладамі
(ПА КУЛЬТСЭКТАРЫ) ТЭХНІЧНЫЯ ІНСТЫТУТЫ, ТЭХНІКУМЫ, РАБФАКІ, ФЗВ і ШКОЛЫ.
У сувязі з гэтым Белдзяржвыдавецтва паведамляе, што вышэй паказаныя ўстановы павінны
ПРЫСЛАЦЬ ЗАЯЎКІ на ўвесь навучальны год НЕ ПАЗЬНЕЙ 15-га ЛІСТАПАДА г. г.
МЕНСК, пэнтральнай кнігарні, а ў гарадох адз. БДВ.
Установы, якія не пададуць свае заяўкі да паказанага тэрміну, ня будуць уключаны ў плян забясьпячэньня чарцёжнымі прыладамі на 1931 год.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

МЦРК 5 лістапада а 7 гадз. ўвечары, ў клюбе САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ
склікае
СХОДКААПАКТЫВУ,
прысьвечаны сьвяткаваньню XIII гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.
Пасьля сходу—вялікая мастацкая частка.
На сход запрашаюцца: прадаўцы крам, дэлегаткі, члены каапэрацыі Гарсавету.
Білеты атрымаць у арганізацыі М�цРК
ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

ЭЛЬВОД
У зьмену абвестні, зьмешчанай у газэце «Зьвязда» ад 3 лістапада